Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЛІСТАПАДА 2012 г. ЧАЦВЕР № 225 (27340) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНКА. ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



Яе не раз параўноўвалі і з Земфірай, і з Алінай Арловай, але яна — Паліна Рэспубліка. Нават яе творчы псеўданім падкрэслівае яе выключнасць і незалежнасць.



Як маладому чалавеку адкрыць сваю справу? Менавіта для тых, хто сапраўды хоча рабіць нешта свае, і існуе ў сталіцы інкубатар малога прадпрымальніцтва.




Праз два тыдні вызначыцца прадстаўнік Беларусі на конкурсе «Еўрабачанне-2013». Сярод 10 фіналістаў мы ўбачым усяго 2 дзяўчат і не пачуем (на жаль) ніводнай беларускамоўнай песні. Што ж, давядзецца выбіраць з таго, што ёсць.

## ЛІЧБА ДНЯ

*766 экзэмпляраў газет на 1000 чалавек насельніцтва выпускаецца ў краіне. Па гэтаму паказчыку Беларусь займае трэцяе месца сярод краін СНД. Летась выдавалася 693 найменні газет, сярод якіх 262 — рэспубліканскія, 50 — абласныя, 142 — гарадскія, 117 — раённыя. На рускай мове выйшла 73% назваў газет, на беларускай мове — больш за 26%. Гадавы тыраж газет склаў 495 млн экзэмпляраў. Разавы тыраж газет перавысіў 7 млн экз.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +4° |
| Віцебск | +4° |
| Гомель | +6° |
| Гродна | +5° |
| Магілёў | +5° |
| Мінск | +5° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.11.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8570,00 | ▲ |
| Еўра | 10930,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 272,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1049,86 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Дэпутат і выбаршчык: твар да твару

# ПЕРШЫ ПРЫЁМ




Фота Волгі МЯДЗВЕДЗЕВАЙ.

**ЛЮДМІЛЕ МІХАЛЬКОВАЙ не прывыкаць: у якасці кіраўніка апарату Гомельскага абласнога суда яна апошнія паўтара дзясятка гадоў рэгулярна прымала грамадзян з самымі рознымі іх праблемамі. Але на гэты раз да яе прыйшлі не як да высокакваліфікаванага юрыста (хаця былі і такія) і не як да старшыні абласнога суда, а як да чалавека, які прадстаўляе іх, жыхароў беларускага Палесся, інтарэсы ва ўладзе краіны. Першы прыём сваіх выбаршчыкаў у якасці старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Людміла Міхалькова правяла ў Жыткавічах.**

## Дрэнная вуліца

Спачатку былі тэлефонныя званкі. Па некалькіх (напрыклад, пра немагчымасць ветэрану вайны купіць у гаспадаркі зерне за грошы) разабраліся супрацоўнікі райвыканкама без удзелу дэпутата, зрабіўшы званок кіраўніку гаспадаркі.

Потым дазваніліся жыхары вуліцы Рабочая ў Жыткавічах, адразу двое, і, як аказалася, звярнуліся яны да Людмілы Міхальковай не ўпершыню. Са скаргай на адсутнасць на вуліцы райцэнтра асвятлення і дарогі жыткавічане прыходзілі на сустрэчу з Міхальковай яшчэ тады, калі яна была кандыдатам у дэпутаты. «Мы — людзі сталага веку і не можам скакаць па ямах, каб дабрацца да цэнтральнай вуліцы», — ледзь не плача жанчына па тэлефоне. Людміла Сцяпанаўна просіць **намесніка старшыні райвыканкама Уладзіміра БЫСТРЭНКУ** патлумачыць, чаму вуліцу даўжынёй у адзін кіламетр не ўдаецца прывесці ў парадак.

— Калі б быў дыферэнцыяваны падыход у размеркаванні бюджэтных грошай на добраўпарадкаванне, можна было б накіраваць іх на прывядзенне ў парадак менавіта гэтай вуліцы, але грошай недастаткова, а праблем шмат. Сёлетняй сумы, якая была закладзена па галіне ЖКГ, на вуліцу Рабочая не хапіла. Колькі грошай нам дадуць на наступны год — пакуль не ведаю, — кажа намеснік старшыні райвыканкама.

— Якім чынам раён вырашае, куды накіроўваць сродкі ў першую чаргу? — цікавіцца дэпутат і, не пачуўшы выразнага адказу, задае наступнае, больш прамое пытанне: — Ці можна знайсці сродкі, каб у бліжэйшы час зрабіць там дарогу, па якой змогуць хадзіць людзі?

— Будзе праходзіць абласная калегія камітэта па архітэктуры і будаўніцтве. Там я зраблю запыт аб дапамозе намесніку старшыні аблвыканкама Уладзіміра Надтачаева. Калі будуць выдзелены сродкі, мы зробім дарогу. СТАР. 3

■ У сталіцы

## МІНЧАНЕ ПЕРАЛІЧЫЛІ Ў БЮДЖЭТ БОЛЬШ ЯК 36 трлн РУБЛЁЎ

**За 10 месяцаў гэтага года падаткаплацельшчыкі сталіцы пералічылі ў кансалідаваны бюджэт 36,1 трлн рублёў, паведамляе карэспандэнт агенцтва «Мінск-Навіны».**

Паводле слоў прадстаўнікоў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску, з гэтай сумы ў рэспубліканскі бюджэт было накіравана 19,7 трлн рублёў. Астатняя частка паступіла ў гарадскую казну. Асноўная частка сродкаў (99%) сфарміравана за кошт плацяжоў, пералічаных у добраахвотным парадку, — удакладнілі спецыялісты. Дарэчы, кансалідаваны бюджэт Мінска за гэты перыяд на 40,5% сфарміраваны за кошт паступленняў ад падатку на дабаўленую вартасць. Таксама значныя аб'ёмы плацяжоў па падатку на прыбытак (18,4%), падаходным падатку (13,7%), акцызах (6,4%), адлічэннях у інавацыйныя фонды (2,4%) і падатку на нерухомасць (1,8%).

Амаль чвэрць кансалідаваных даходаў горада (23%) — гэта ўклад плацельшчыкаў Савецкага раёна.

■ У краіне

## АЙЧЫННЫЯ ВУЧОНЫЯ РАСПРАЦАВАЛІ ЎНІКАЛЬНУЮ СІСТЭМУ АВІЯЦЫЙНЫХ ЗДЫМКАЎ

**Пра гэта паведаміў загадчык лабараторыі сістэматэхнікі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі, кіраўнік задання дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Касмічныя сістэмы і тэхналогіі» Мікалай Мурашка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Створаная ў Беларусі сістэма авіяцыйных здымак не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Яе плануецца выкарыстоўваць у інтарэсах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Апаратура таксама дасць магчымасць больш эфектыўна развіваць авіяцыйны сегмент сістэмы дыстанцыйнага зандавання Зямлі.

Авіяцыйныя здымкі для вырашэння розных задач рабіліся ў Беларусі і раней. Аднак для гэтага выкарыстоўваліся плёнкавыя апараты, якія даюць недастаткова высокую якасць выявы. «Прыйшлося выбіраць: альбо купляць сучасную лічбавую апаратуру за мяжой (а кожны такі апарат каштуе каля $1,5 млн), альбо распрацоўваць уласнае абсталяванне», — растлумачыў вучоны.

Беларуская праца як у бачным, так і ў інфрачырвоным спектрах. «Па сутнасці, гэта своеасаблівая лятаючая лабараторыя», — адзначыў Мікалай Мурашка. Абсталяванне дазваляе распазнаваць аб'екты памерам у некалькі сантыметраў з вышыні 1 км і атрымліваць як плоскія, так і трохмерныя выявы.

■ У свеце

## РАБОТНІКАМ НЯМЕЦКІХ ЦЭРКВАЎ ДАЗВОЛІЛІ ЗАБАСТОЎКІ

**Служачыя нямецкіх цэркваў і царкоўных арганізацый па рашэнні суда атрымалі права праводзіць забастоўкі, паведамляе Deutsche Welle. У той жа час, спачатку яны абавязаны паспрабаваць дамовіцца з працадаўцамі аб умовах іх работы пры дапамозе прафсаюзаў.**

Як адзначае выданне Die Welt, нованавядзенне закране каля 1,3 мільёна служачых цэркваў і царкоўных арганізацый у Германіі, у тым ліку работнікаў буйных дабрачынных таварыстваў Diakonie і Caritas.

У дачыненні да работнікаў цэркваў і царкоўных арганізацый у Германіі дзейнічае асобнае працоўнае заканадаўства, якое надае гэтым структурам значную долю аўтаноміі, асабліва ў тым, што датычыць умоў працы і яе аплаты. Буйныя нямецкія прафсаюзы патрабуюць, каб рэлігійныя арганізацыі прынялі стандартныя працоўныя дагаворы.

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ ВЫКАНАННЯ ЎСІХ ПАКАЗЧЫКАЎ 2012 ГОДА.

**Такую задачу ён паставіў 20 лістапада, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Для таго, каб пачуць апаніруючы ўраду пункт гледжання, Аляксандр Лукашэнка запрасіў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэя Кабякова і памочніка кіраўніка дзяржавы Пятра Пракаповіча. На сустрэчы таксама прысутнічалі міністр эканомікі Мікалай Снапкоў і міністр фінансаў Андрэй Харкавец.

Прэзідэнт абазначыў круг пытанняў, на якія хацеў атрымаць адказы ўрада.

У першую чаргу кіраўнік дзяржавы цікавіўся тэмпамі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 2012 годзе і планамі на будучы год. «Учора мы такую размову пачалі з міністрам эканомікі і памочнікам па эканоміцы. Аказваецца, поўны разброд і хістанне! — адзначыў Прэзідэнт. — Кажуць, галоўнае — гэта экспарт, а ВУП — гэта няважна. Я разумею, што экспарт для нас — гэта жыццёва важны паказчык, але без ВУП не будзе і вялікіх аб'ёмаў экспарту. Зразумела, што наша эканоміка такая, што калі экспарту або ВУП больш трэба, то і імпарт будзе вырастаць. У нас жа ёсць дабаўленая вартасць, давайце будзем выраблять тавары з большым прыбыткам. Не страшна, што імпарт узрасце, галоўнае, каб экспарт адпаведна потым вырас, каб мы не толькі кампенсавалі затраты па імпарце, але і атрымалі добрую дабаўленую вартасць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што хацеў бы пачуць і аб выніках гэтага года. «Зноў крытыкуючы, што мы не выконваем уласныя абавязацельствы, не выконваем рашэнні Прэзідэнта, якія зацверджаны з вашай падачы па гэтым годзе. І, зразумела, будзе вельмі цяжкі будучы год», — сказаў Прэзідэнт.

Яшчэ адной важнай тэмай, закранутай кіраўніком дзяржавы, стала аказанне жыллёва-камунальных паслуг.

«Хацелася б пачуць, што новага вынайшлі ва ўрадзе па ЖКГ і абслугоўванні памяшканняў, дзе жывуць нашы людзі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка згадаў пра матэрыял, прачытаны ў газеце «Советская Белоруссия». «Павел Якубовіч, малайчына, вельмі тонка ўеў увесь урад і асабліва горад Мінск, — адзначыў Прэзідэнт. — Добра, што сродкі масавай інфармацыі ўзнімаюць гэту тэму, як людзей заганяюць у прыватныя кампаніі па абслугоўванні будынкаў і памяшканняў. Гэта, дарэчы, не толькі ў прыватных кампаніях. Там нейкія з'явіліся таварыствы забудоўшчыкаў, ці як яны называюцца. І калі я асабіста пацікавіўся ў некаторых людзей, яны гавораць: мы аб гэтым не ведаем, нам вось сказалі, і мы плацім дадаткова за гэта і за тое». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такая практыка недапушчальна: «Гэта недазвольны падыход да арганізацыі справы, і за гэта хтосьці адкажа!»

Прэзідэнт папярэдзіў, што ўсё павінна быць добраахвотна. «Калі людзі не хочуць гэтых прыватнікаў і ўсялякіх жулікаў, якія гатовы там пажывіцца, значыць, яны павінны абслугоўвацца дзяржавай. Так, як у нас гэта прынята. Гэта прашу мець на ўвазе. Толькі добраахвотна!» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, Прэзідэнт звярнуў увагу на пытанні жыллёвага будаўніцтва: «Я не столькі хачу пачуць аб квадратных метрах, колькі пра тое, якая сітуацыя цяпер. У нас разбалансавана сістэма ў жыллёвым будаўніцтве!». Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў таксама далажыць аб аб'ёмах знешніх паслуг, якія аказваюць беларускімі будаўнікамі, перспектывамі іх работы ў наступным годзе.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся таксама вынікамі нядаўняга візіту прэм'ер-міністра ў Казахстан, Бангладэш і Індыю, перспектывамі беларускай прысутнасці ў гэтым рэгіёне.

Як далажыў Міхаіл Мясніковіч, візіт быў даволі выніковым. Акрамя іншых былі заключаны перспектыўныя кантракты па пастаўках тэхнікі БелАЗ, МАЗ, арганізацыі зборачных вытворчасцяў трактароў, кар'ерных самазвалаў у Казахстане, а таксама па будаўніцтве заводаў па выпуску прадуктаў харчавання ў Бангладэш і Казахстане.

Акрамя таго, вялікія перспектывы ў рабоце з гэтымі дзяржавамі адкрываюцца ў галіне паставак калійных угнаенняў. Дасягнуты дамоўленасці з Бангладэш аб тым, што іх дзяржаўная кампанія будзе штогод купляць не менш за 500 тыс. тон калійных угнаенняў, яшчэ 250-300 тыс. тон будуць закупляцца камерцыйнымі структурамі.

Індыя гатова купляць у Беларусі 2,7 млн тон калійных угнаенняў, што складае фактычна яе поўную патрэбнасць.

Кіраўнік дзяржавы даручыў нарошчваць беларускую прысутнасць на рынках гэтых дзяржаў. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу больш актыўна працаваць з краінамі Паўднёва-Амерыканскага рэгіёна, асабліва па рынку калійных угнаенняў і тэхнікі, у прыватнасці з Бразіліяй.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, на гэты час праблемным пытаннем застаецца баланс па нафце на 2013 год. «У мяне запланавана тэлефонная размова з Дзмітрыем Мядзведзевым. Пакуль тыя аб'ёмы нафты, якія прагаворваюцца на ўзроўні намесніка старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі, нас не задавальняюць, і ёсць важкія аргументы чаму. Нават з улікам таго, што мы дамовіліся, што каля 3 млн тон нафтапрадуктаў у наступным годзе мы будзем перадаваць на рыначных умовах для Расійскай Федэрацыі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Акрамя таго, у Беларусі ёсць высакакласныя нафтаперапрацоўчыя заводы, якія вырабляюць нафтапрадукты еўрапейскай якасці, і гэтыя магутнасці, у мадэрнізацыю якіх укладзены вялікія сродкі, павінны працаваць эфектыўна і пад поўную загрузку.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што «адносна паліўна-энергетычнага комплексу ўсе пытанні па рабоце ў чацвёртым квартале ўрэгуляваны, застаюцца пытанні яшчэ некаторага дабору па 2013 годзе». Беларусь разлічвае на пастаўкі 23 млн тон нафты ў 2013 годзе, у гэтым годзе аб'ём пастаўленай нафты складзе 21,5 млн тон.

Кіраўнік дзяржавы даў адпаведныя даручэнні адносна далейшай работы па гэтым напрамку.

Прэзідэнту таксама было паведамлена аб выкананні ўсіх заданняў па закладцы стабілізацыйных фондаў.

Аляксандр Лукашэнка ўказаў на неабходнасць поўнага кантролю сітуацыі на цэнавым рынку для таго, каб сезоннасць не ўплывала на ўзровень інфляцыі.

Прэзідэнт строга запатрабаваў выканаць усе паказчыкі 2012 года, асабліва па валавым унутраным прадукце.

Прэм'ер-міністр запэўніў, што ўсе даручэнні Прэзідэнта будуць, безумоўна, выкананы.

# АДНАРАЗОВАЙ ДЭВАЛЬВАЦЫІ НАЦБАНК НЕ ПЛАНУЕ

**Пра гэта ўчора паведаміла карэспандэнту «Звязды» старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзея Ермакова.**

— У нас сёння няма неабходнасці для правядзення запланаванай дэвальвацыі айчыннай валюты, — адзначае кіраўнік Нацбанка. — Нічога падобнага ў першыя дні студзеня не будзе, бо нельга зноў наступаць на старыя граблі...

На мінулым тыдні галоўны банк краіны прадаваў валюту на біржы, а гэтымі днямі Нацбанк ужо купляе там валюту, пасля чаго курс рубля аслабеў. «Гэта нармальна, калі курс рубля крыху плавае ў розныя бакі. Ён рэгулюецца рынкам, дзе адным з сур'ёзных гульцоў з'яўляецца Нацбанк», — лічыць спадарыня Ермакова.

Тут трэба адзначыць, што днямі Нацбанк прыпыніў для юрыдычных асоб выдачу валютных крэдытаў па пэўных пазіцыях. Цяпер крэдыты ў замежнай валюце суб'екты гаспадарання могуць браць толькі для ажыццяўлення знешнеэканамічнай дзейнасці. Гэта робіцца дзеля таго, каб цалкам кантраляваць сітуацыю на валютным рынку. Нельга дапусціць нейкіх крытычных сітуацый, калі на біржу трапяць юрасобы з вялікімі сумамі беларускіх рублёў для набыцця валюты для пагашэння валютных крэдытаў. Нацбанк загадзя прадугледжвае падобную рызыку і абмяжоўвае выдачу валютных крэдытаў, калі гэта не звязана з імпартам. Сёння ў Нацбанку спадзяюцца, што такое абмежаванне па выдачы валютных крэдытаў юрасобам будзе мець кароткачасовы характар. Адказваючы на пытанні журналістаў на XI Міжнародным форуме па банкаўскіх інфармацыйных тэхналогіях Надзея Ермакова паведаміла, што ўсе запланаваныя дзяржпраграмы і рэальная эканоміка крэдытуюцца Нацбанкам у поўнай меры. Аднак сталі больш жорсткімі патрабаванні пры выдачы такіх крэдытаў. Цяпер банкамі абавязкова разглядаецца эфектыўнасць выкарыстання крэдытных сродкаў і рэальная магчымасць іх вяртання.

У Нацбанку ў бліжэйшай перспектыве не бачаць сэнсу ў змяненні стаўкі рэфінансавання. Стаўка рэфінансавання застаецца стабільнай з верасня і складае зараз 30 працэнтаў гадавых. Надзея Ермакова ўдакладніла, што сітуацыя ў эканоміцы складваецца цяпер такім чынам, калі адсутнічаюць умовы для зніжэння стаўкі рэфінансавання, аднак яна і не павялічваецца.

Асобна Надзея Ермакова падкрэсліла, што Нацбанк не мае права ажыццяўляць грашовую эмісію для нарошчвання тэмпаў росту ВУП да запланаванага сёлета ўзроўню 5—5,5 працэнта. «Эмісійных грошай у Беларусі не будзе», — запэўніла кіраўнік Нацбанка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ АДКРЫЎ У КАЛЯДЗІЧАХ ЛАГІСТЫЧНЫ ЦЭНТР

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч адкрыў учора ў Калядзічах 10-ы ў рэспубліцы лагістычны цэнтр, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

У працэсе будаўніцтва гандлёва-лагістычнага цэнтра РУП «Мінск Крышталь» былі рэалізаваны ўнікальныя для краіны рашэнні. У прыватнасці, гэта вышынне 8-узроўневае сховішча прадукцыі — да 16 м — у той час як звычайна вышыня стэлажоў складае ў сярэднім 8-12 м. Кошт праекту склаў больш як Br122 млрд. Гэта як крэдытныя сродкі, так і сродкі прадпрыемства.

Міхаіл Мясніковіч азнаёміўся з аб'ектам, а таксама выслухаў прапановы кіраўніцтва прадпрыемства па вынасу вытворчых магутнасцяў РУП «Мінск Крышталь» за межы Мінска.

У гутарцы з журналістамі прэм'ер-міністр нагадаў, што ў Беларусі рэалізуецца дзяржаўная праграма па развіцці лагістычнай сістэмы да 2015 года, у рамках якой ужо ўведзена 9 лагістычных цэнтраў, адбылося адкрыццё 10-га. Яшчэ 30 аб'ектаў будуюцца. Першая чарга аднаго з такіх аб'ектаў — буйнога лагістычнага цэнтра, які будуецца за кошт азербайджанскіх інвестыцый, будзе адкрыта ўжо да канца гэтага года. Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, гандлёва-лагістычныя цэнтры сёння дазваляюць вырашыць шэраг задач. Выкарыстанне перадавых тэхналогій дазваляе палегчыць працу рабочых, паскорыць працэс адгрузкі прадукцыі. У тым ліку, што немалаважна, яны даюць пакупніку магчымасць у адным месцы выканаць загрузку адразу некалькіх відаў прадукцыі.

Самай галоўнай і самай актуальнай функцыяй гандлёва-лагістычных цэнтраў, на думку прэм'ера, з'яўляецца развіццё экспарту. «Сёння імпарцёр досыць капрызны, яму прапануюць прадукцыю на любы густ, таму мы павінны быць вельмі цікавымі для таго, каб наш тавар выходзіў на замежныя рынкі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Міхаіл Мясніковіч расказаў, што кантралюе ўсе пытанні па гандлёва-лагістычных цэнтрах, і некаторыя з іх нагадваюць прымітыўную складскую гаспадарку. Ад гэтага трэба адыходзіць. Для гэтага Беларусь павінна выкарыстоўваць як геаграфічныя магчымасці, так і вытворчы патэнцыял.

## Факт

### ПРОДАЖ МАЦАВАНЫХ ПЛАДОВЫХ ВІН У МІНСКУ ЗАБАРАНЯЦЬ НЕ БУДУЦЬ

**Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама.**

Мінгарвыканкам прыняў рашэнне, якое адмяняе правядзенне лакальнага эксперыменту па забароне рэалізацыі такой прадукцыі ў аб'ектах рознічнага гандлю Мінска. Планавалася, што мацаваныя пладовыя віны ў сталічных магазінах перастануць прадаваць з 1 снежня 2012 года, забарона павінна была прадоўжыцца да 1 лютага 2013 года.

## Кватэрнае пытанне

### Бацькоў па месцы жыхарства дзяцей зарэгістраваць можна

***Наша сям'я займае службовую кватэру. «Лішніх» метраў у ёй няма, але ж плануем забраць да сябе састарэлага хворага свёкра. Ці зможам мы прапісаць яго, каб, прынамсі, паставіць на ўлік у паліклініцы?***

**В. Б.**, *г. Слуцк.*

У адпаведнасці з арт. 94 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ЖК), карыстанне службовымі жылымі памяшканнямі вызначаецца правіламі дагавора найму жылога памяшкання, акрамя правілаў, прадугледжаных арт. 58—61, 74—89 вышэйзгаданага кодэкса.

Паводле арт. 57 ЖК, наймальнік жылога памяшкання мае права ў вызначаным парадку з пісьмовай згоды ўсіх членаў сям'і, якія пражываюць з ім, усяліць у занятае ім жылое памяшканне мужа (жонку), дзяцей і бацькоў, іншых сваякоў, а таксама непрацаздольных утрыманцаў і іншых грамадзян.

Палажэннем аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 верасня 2007 г. № 413 (далей — Палажэнне), вызначана, што выпадкі абмежавання рэгістрацыі грамадзян (напрыклад, калі пасля рэгістрацыі грамадзяніна забяспечанасць агульнай плошчай у жылым памяшканні стане менш чым 15 кв. метраў на аднаго чалавека) не распаўсюджваюцца на рэгістрацыю, у прыватнасці, бацькоў па месцы жыхарства дзяцей.

Рэгістрацыя грамадзян па месцы жыхарства ажыццяўляецца падраздзяленнямі па грамадзянстве і міграцыі органаў унутраных спраў. Для рэгістрацыі па месцы жыхарства грамадзянін абавязан не пазней чым за адзін месяц з дня прыбыцця на новае месца жыхарства звярнуцца да асобы, адказнай за рэгістрацыю, а пры яе адсутнасці — у орган рэгістрацыі.

Для рэгістрацыі па месцы жыхарства грамадзянін абавязаны падаць заяву аб рэгістрацыі па месцы жыхарства ў вызначанай форме, дакументы, якія сведчаць асобу і з'яўляюцца падставай для рэгістрацыі, а таксама пры неабходнасці і іншыя дакументы, пералічаныя ў п.13 Палажэння.

Калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ўсяленне грамадзяніна ў жылое памяшканне ажыццяўляецца толькі са згоды паўналетніх членаў яго сям'і, якія маюць права карыстання жылым памяшканнем, то такая згода афармляецца шляхам пастаўлення ў заяве аб рэгістрацыі па месцы жыхарства подпісаў гэтых асоб ці асобным дакументам і сведчыцца асобай, адказнай за рэгістрацыю, а пры яе адсутнасці — службовай асобай органа рэгістрацыі, або натарыусам ці іншай службовай асобай, якой у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дадзена права ажыццяўляць натарыяльныя дзеянні.

**Віктар САВІЦКІ**

# ПЕРШЫ ПРЫЁМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**АД РЭДАКЦЫІ.** *Жыхары вуліцы Рабочая патлумачылі «Звяздзе»: «Наша вуліца старая, яна мяжуе з плотам леспрамгаса і пачынаецца ад цэнтральнай вуліцы горада імя Карла Маркса. Калісьці тут ляжаў асфальт. Але паступова гусенічныя трактары леспрамгаса асфальт сапсавалі. А калі пракладалі газ, асфальт канчаткова разбурылі. Газ праклалі, а дарожнае пакрыццё не аднавілі. Цяпер вуліца скрозь у ямах, пасля дажджу — лужыны. Ёсць адна такая, што яе ўвогуле ніяк не абысці. Акрамя таго, па ўсёй вуліцы няма асвятлення. Зараз цямнее рана, і прайсці па вуліцы немагчыма».*

*21 лістапада ліхтары на вуліцы зноў запрацавалі. Уладзімір Быстрэнка пацвердзіў «Звяздзе», што зрабіў запыт у аблвыканкам на вылучэнне 200 млн рублёў для добраўпарадкавання вуліцы Рабочая, але адказу пакуль не атрымаў.*

## Нядобрая кватэра

Наступны званок быў ад жанчыны, якая пражывае ў доме №5 па вуліцы Паркавая ў Жыткавічах:

— Наш дом быў пабудаваны ў 1984 годзе. З таго часу я ў ім жыву, і з таго часу жыхары трох пад'ездаў нашага дома пакутуюць зімой ад холаду. У чацвёртым пад'ездзе, які знаходзіцца каля ўвахода цеплатрасы ў дом, у кватэрах цёпла. А ў нас вышэй за 15 градусаў слупок тэрмометра не падымаецца. 28 гадоў мы спрабуем дабіцца ад службаў, на балансе якіх знаходзіцца дом, каб сітуацыя была выпраўлена. Аднак і па сёння ў халодныя месяцы вымушаны класціся спаць у вопратцы, мерзнуць, хварэць і змагацца з цвіллю. Больш за тое, сёлета пры так званай ачыстцы ацяпляльнай сістэмы камунальнікі злівалі ваду з радыятарных батарэй у падвал дома, з-за чаго павялічылася вільгаць у маёй кватэры на першым паверсе. У выніку на кухні з'явілася цвіль...

І зноў Уладзімір Быстрэнка, які курыруе ў раёне пытанні камунальнай гаспадаркі, тлумачыць Людміле Міхальковай: «Мы неаднаразова выязджалі на гэтую кватэру летась. Праблема была ў тым, што сістэме цэнтральнага ацяплення не хапала магутнасці, каб забяспечыць цыркуляцыю гарачай вады. Мы паставілі дадатковыя насосы».

Людміла Міхалькова ў той жа дзень увечары разам з прадстаўнікамі мясцовай улады і мясцовага самакіравання наведала кватэру ў халодным доме па вуліцы Паркавая. «Так, у адным пакоі было прыкметна больш холадна, чым у іншых, — расказала яна потым «Звяздзе». — Дадатковыя насосы не дапамаглі, і пакуль раён не бачыць выразнай магчымасці вырашыць гэтую праблему».

**АД РЭДАКЦЫІ.** *15 лістапада кватэру жанчыны, якая звярнулася да дэпутата, наведала яшчэ адна камісія, у складзе якой былі ўрачы санстанцыі. Камісія зафіксавала адсутнасць адмосткі фундамента, сляды вільгаці на сценах, халодную батарэю ў адным з пакояў, вільготную падлогу ў падвале. Тэмпература ў жылых пакоях была 18-20 градусаў, што адпавядае санітарным нормам. Аднак гаспадыня кватэры ўпэўнена, што перад візітам камісіі супрацоўнікі кацельнай тапілі больш, чым звычайна, каб «нацягнуць» тэмпературу да нормы. Да таго ж тэмпература паветра на вуліцы была плюсавая. Увэю праз два дні ў кватэры па Паркавай, 5 зноў стала холадна.*

*«Адзіны эфектыўны спосаб вырашыць праблему — паставіць індывідуальны кацёл у кватэры, — абагульне меркаванне камунальных службаў старшыня Жыткавіцкага раённага савета дэпутатаў Ніна РАМАНОВІЧ. — Але ў раёна такіх грошай няма, а ўладальнікі кватэр за свой кошт не могуць або не жадаюць гэтага рабіць».*

*«Не веру, што праблема ў «недастатковай магутнасці сістэмы ацяплення», — кажа гаспадыня халоднай кватэры. — Чаму тады ў суседнім будынку людзі ходзяць распранутыя — настолькі ў іх цёпла? Сістэма ж адна. Проста дрэнна працуюць камунальныя службы».*

## Нязручны маршрут

— Мая дачка купіла жыллё на вуліцы Петруся Броўкі, у яе трое дзяцей. Школа і садок знаходзяцца за 4 і 3 кіламетры. Адно дзіця вучыцца ў другую змену, сама дачка працуе. І цяпер у яе няма ніякай магчымасці адпраўляць дзяцей у садок і школу, самой ездзіць на працу, а потым усім вяртацца дадому, бо гарадскі аўтобус у гэтым раёне горада ходзіць толькі тры разы на дзень, — са слязамі ў голасе паведаміла пра чарговую праблему яшчэ адна жыхарка райцэнтра.

І зноў пытанне ўперлася ў грошы.

— Пусціць аўтобусны маршрут часцей няма магчымасці, бо пасажырскія гарадскія перавозкі ў нас фінансуюцца бюджэтам, яны акупляюцца штомесяц толькі на 20 — 26%. У гэтым раёне горада ў пераважнай большасці













пражываюць цыганы, якія не карыстаюцца гарадскім аўтобусам, у асноўным на ім ездзяць школьнікі, таму маршрут зусім не акупляецца, — упэўнены кіраўнік Жыткавіцкага філіяла Гомельаблаўтатранса.

— Аднак там жывуць людзі, не важна, якой нацыянальнасці, і я не паверу, што з усіх прылеглых да маршруту вуліц нязручна толькі адной жанчыне з трыма дзецьмі, — усумнілася дэпутат. — Прашу вас вывучыць гэтае пытанне і пралічыць магчымасць дадаць дадатковы рэйс гарадскога аўтобуса.

## Гора-гарадок

Хадаком ад грамадскасці назваў сябе жыхар аграгарадка Сяменча. Ён прыйшоў падрыхтаваны: выклаў перад дэпутатам фатаграфіі сваёй вёскі, афіцыйныя адказы на ранейшыя скаргі. Людміла Сцяпанаўна ўголас зачытвае ліст, датаваны 2008 годам, у якім абяцанне аднавіць дарожнае пакрыццё ў вёсцы пасля пракладання там цеплатрасы.

— І што, дагэтуль не зроблена? — пытаецца яна.

— Усе ўжо і забылі! Усё кінутае. Прыязджаюць начальнікі вышэйшыя, а пытанні не вырашаюцца. Я чацвёрты раз іду... Аграгарадок наш можна назваць «гора-гарадок». Свідравіну зрабілі ў балоце, вада дрэнная, чаротам пахне... «Жыткавіцкі камунальнік» абяцаў калодзеж зрабіць каля хлявоў: у нас многія жывуць у шматпавярховіках і трымаюць гаспадарку, дык вады з кватэры каровам не наносішся... Нічога не зроблена. Мяне Какора (старшыня Жыткавіцкага райвыканкама — **«Зв.»**) пытаецца: «Што ты ездзеш адзін?» А людзі кажуць: «Паедзь хоць ты!» Ніхто не хоча ехаць. Паглядзіце на гэтыя фатаграфіі! Бачыце? Гэта яны дамы з вуліцы пафарбавалі, а за рагом трэшчыны... У нас тратуары калісьці былі, цяпер няма. У мяне яшчэ ёсць фатаграфія, дзе штыр вось такі з тратуара тырчыць. Чалавек калі ўпадзе, бяда будзе. Ці гэтак можна?

— Вядома, нельга! — рэагуе дэпутат. І просіць службовыя асобы аспрэчыць тое, пра што расказаў жыхар Сяменчы.

Раённае начальства пагаджаецца са скаржнікам толькі часткова:

— Дарогі там сапраўды не назавеш добрымі. Сёння сродкаў, якія вылучаны на добраўпарадкаванне аграгарадка, недастаткова. Дарожна-эксплуатацыйнае ўпраўленне № 111 Гомельаблдарбуда, на балансе якога знаходзіцца дарога у пасёлку, вымушана абмяжоўвацца падсыпкай і ямачным рамонтам.

Астатнія абвінавачванні, сцвярджаюць прадстаўнікі мясцовай улады, несправядлівыя. Свідравіна зроблена па ўсіх правілах, там, дзе вызначылі ёй месца спецыялісты. Балоты ў Палессі паўсюдна. У Сяменчы пабудавана станцыя абезжалезвання вады, і якасць пітной вады ў аграгарадку ў межах нормы (ёсць дакументальнае пацвярджэнне).

На капітальны рамонт жылфонду існуе зацверджаная праграма і графік. Гэта вельмі дарагі рамонт, таму раён звычайна абмяжоўваецца бягучым рамонтам, папраўляючы ў першую чаргу дахі і стыкі. Калодзежы паблізу ад прыватных хлявоў у населеным пункце з цэнтральным водазабеспячэннем камунальныя службы выкапаць могуць, але толькі за грошы заказчыка — у прыватным парадку.

Пасля ўсіх тлумачэнняў з'яўляецца ўражанне, што жыхар Сяменчы не столькі прадстаўляе інтарэсы сваіх аднасяльчан, колькі атрымлівае задавальненне ад магчымасці паскардзіцца і прывабіць увагу высокага начальства да сваёй асобы.

— Праз месяц я прыеду ў Сяменчу і паразмаўляю з людзьмі, каб высветліць, наколькі гэты чалавек адзінокі ў сваіх прэтэнзіях, — абяцае Людміла Міхалькова.

## Няшчасныя маці

У той дзень у Жыткавічах да дэпутата Палаты прадстаўнікоў дазваніліся 8 чалавек і 15 прыйшлі на прыём. Характэрна для Беларусі: было некалькі маці, якія прыйшлі заступіцца за сваіх дарослых дзяцей. У адной дачка сядзіць за віну ў пакутлівай смерці сужыцеля, у другой сын змешчаны ў ізалятар на 15 сутак за хуліганства, у трэцяй у цеснай хаце, акрамя самой і мужа, жывуць два дарослыя сыны, якія нідзе не працуюць, дачка і двое нованароджаных унукаў...

Там, дзе пытанне датычылася судовага рашэння або прысуду, Людміла Міхалькова папярэджвала: як дэпутат, яна цяпер не мае права ні знаёміцца з судовай справай, ні прадпісваць указанні суду. Тым не менш Людміла Сцяпанаўна ўважліва выслухоўвала кожнага, чытала дакументы, і, калі пагаджалася з заяўнікам, бралася перадаць зварот у пракуратуру.

...Без папярэдняга запісу прыйшла старая жанчына, якая пасля смерці мужа не аформіла вясковы дом і ўчастак зямлі.

— 50 гадоў жыву ў гэтым доме, будавала яго разам з мужам пасля вайны, голая, босая... За што я павінна плаціць больш за мільён? — не разумее яна. — Я два гады таму захварэла на анкалогію, мне 75 гадоў... А цяпер я і страхоўку не плачу, бо дом не аформлены... Дзеці? Ёсць. Добрыя ў мяне дзеці! Але я ў іх грошы не папрашу. Я сябе ўшчамляю, а ім дапамагаю...

У нейкі момант падалося, што Людміла Міхалькова гатова дастаць гэты мільён з уласнага кашалька, але, пачуўшы пра дзяцей, яна нявесела смяецца і качае галавой.

**АД РЭДАКЦЫІ.** *Па просьбе дэпутата сацыяльны аддзел раёна вылучыў жанчыне 300 тысяч рублёў адраснай дапамогі, але супрацоўнікі адміністрацыі сумняваюцца, што і пасля гэтага жанчына аформіць свой дом і ўчастак у адпаведнасці з законам.*

Прыём доўжыцца каля 5 гадзін. У кароткім інтэрв'ю мясцовым СМІ Людміла Міхалькова дзякуе ўладам раёна за дапамогу, а выбаршчыкам — за давер. Пазней мы сустракаемся з ёй ужо ў Мінску, у Палаце прадстаўнікоў, каб невялікім эксклюзіўным інтэрв'ю для нашай газеты падсумаваць уражанні таго дня ў Жыткавічах.

## Зерне ў кожным звароце

**— Чым адрозніваўся гэты прыём ад падобных сустрэч у будынку суда?**

— Адчуваннем уласнай бездапаможнасці. На пасадзе старшыні суда я сама прымала рашэнні. А тут мне прыходзілася кожны раз некага прасіць: камунальнікаў, дырэктара аўтапарка, аддзел адукацыі, раён... Прычым разумею, што калі грошай няма, і раён залатае сёння адну дзірку, то заўтра людзі прыйдуць скардзіцца на іншую.

**— Але ж вы, як заканадаўца, можаце выступіць з прапановай нешта змяніць, каб палепшыць сітуацыю... Ёсць такія думкі пасля сустрэч у акрузе?**

— Безумоўна, ёсць, і я абавязкова буду нешта прапаноўваць, нешта вывучаць больш дасканала. Як дэпутат магу звярнуцца да членаў урада, магу зрабіць запыт. Хутка будзе сустрэча з намеснікам прэм'ер-міністра Міхаілам Русым. Абавязкова выкарыстаю яе, каб агучыць шэраг праблем сваёй акругі, якая, дарэчы, зусім нядаўна была і яго акругай.

**— Якое ўражанне пакінулі звароты людзей?**

— У кожным ёсць зерне. Безумоўна, у пэўнай ступені мясцовыя ўлады недапрацоўваюць. Нешта можна было вырашыць і без майго ўдзелу.

**— Памятаеце жанчыну, дачка якой асуджана за тое, што наўмысна абварыла сужыцеля кіпнем і ён загінуў? Мне падалося, што вы, нягледзячы на ўсю жорсткасць злачынства, шкадуеце абвінавачаную. Вы, як былы суддзя, здольная шкадаваць злачынцаў?**

— Не ўсіх. Калі, напрыклад, мужчына гвалтаваў сваю падчарыцу, ён не выклікае ў мяне ніякага шкадавання. Гэта не значыць, што я ў якасці суддзі выносіла ў падобным выпадку самы суровы прыгавор — заўсёды імкнулася заставацца аб'ектыўнай. Але жанчын заўсёды шкадую. Жанчына не можа быць злачынцам па сваёй прыродзе. Злачынцам яе робяць абставіны. Гэта — не яна. Гэта — мы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. Фота аўтара.**
*Жыткавічы*

■ Прэзентацыі

2012 ГОД КНІГІ

# Чытачам. Ад «Звязды». З любоўю...

**Гэты, сыходзячы, 95-ы год жыцця старэйшай беларускай газеты адзначаны многім... У тым ліку — выданнем дзвюх кніг яе супрацоўнікаў: зборніка мініяцюр Валянціны Доўнар «Каб сказаць... І пачулі» і фотаальбома Анатоля Клешчука «Беларусь. Зямля песняроў». Прэзентацыя іх днямі адбылася ў Бярэзінскай раённай бібліятэцы.**



Фотаальбом ад аўтара — прадпрымальніцы Надзеі Паўлаўне МЕЛЬНІК.

Дробязь, а прыемна: свабодных крэслаў у зале не было.

Дзейства пачалося са шчырага маналогу вядучай свята, спадарыні Тамары Круталевіч «Вы любіце кнігу, як люблю яе я?», а таксама з прыгожай песні пад гармонік, якія проста не маглі не задаць адпаведнага настрою. Ну хаця б таму, што ў зале былі аднадумцы, чытачы, якія, да ўсяго, цудоўна помнілі мелодыю і, відаць, гатовы былі падхапіць словы:

*Колькі ў свеце кніг,*
*Цяжка палічыць.*
*Беларуская*
*Сярод іх зіхціць —*
*Ззяе мудрасцю,*
*свеціць сілаю*
*Для ўсіх людзей —*
*зоркай мілаю...*

Сярод тых, хто прыехаў на гэту прэзентацыю, была старальніца многіх такіх вось «зорак» — вядомая пісьменніца Лідзія Арабей.



Слова — пісьменніцы Лідзіі АРАБЕЙ.

Яна шчыра падзякавала людзям, якія прыйшлі на гэтую сустрэчу: значыць, ім не абыякавая беларуская мова, беларускія пісьменнікі і літаратура наогул.

— У маім сямейным альбоме ёсць фотакартка майго бацькі пачатку 1920-х гадоў. На ёй ён чытае «Звязду». Гэтую ж газету шмат гадоў выпісвала сама, таму ведаю імёны многіх журналістаў...

Цяпер прагматычны час, — прызнала Лідзія Львоўна. Людзі заклапочаныя і занятыя заробляннем грошай. Ім, можа, і часу не стае, каб чытаць вялікія творы. Таму ў моду сталі ўваходзіць абразкі, мініяцюры, дзе, як кажуць, словам цесна, а думкам прасторна. Такую вось кнігу напісала Валянціна Доўнар. Па нашых сцежках, па дарогах яна прайшла як быццам з люстэркам. Трапілі ў яго і станоўчыя моманты, з'явы, і адмоўныя, трапілі людзі добрыя, шчырыя, самаахвярныя і, наадварот, — хцівыя, несумленныя... Усё гэта стварыла малюнак нашага жыцця...

Так атрымалася, што менавіта Беразіно стала адным з першых гарадоў, куды трапіла кніга «Каб сказаць... І пачулі». Таму многія тут паспелі яе прачытаць. Ды што там — нават падзяліцца ўражаннямі — як са старонак раённай газеты (за што асобны дзякуй!), так і на прэзентацыі, добрым словам, дарэчы, узгадаўшы выдавецтва «Харвест» — за добры шрыфт, за прыгожую і зручную вокладку.

Але ж найбольш гаворка ішла пра змест, пра білакасць і пазнавальнасць сюжэтаў.

— У зборніку ёсць абразок, які называецца «Добрая кніжка», — казала, у прыватнасці, настаянная наведвальніца бібліятэкі Алена Строк. — У ім аўтарка распавядае, як ёй на рэцэнзію прынеслі кніжку. Пачала яна чытаць яе ў аўторак, але неяк адразу заснула, у сераду і чацвер — таксама, і ў пятніцу. А ў панядзелак кнігу трэба было аддаць і выказаць меркаванне... Яно прагучала так: «Добрая кніга. Можна раіць... У якасці снатворнага»... Дык вось кніжка «Каб сказаць... І пачулі» — не з такіх. Яна разнапланавая і нечаканая сваімі высновамі, лёгкая і цёплая. Яе, прачытаўшы, не паставіш на паліцу — будзеш трымаць пад рукой.

У зборніку каля тысячы абразкоў, амаль пяцьсот старонак. Але ж падчас размовы па руках прысутных хадзіла яшчэ адна кніжка: захопленым «Ух ты... Якая прыгажосць!» ці не кожны вітаў важкі фаліянт — фотаальбом Анатоля Клешчука.

— Цягам апошніх сямі гадоў, — расказваў аўтар, — я не раз звяртаўся да твораў нашых класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, пры любой магчымасці стараўся наведаць мясціны, дзе яны нарадзіліся, дзе жылі. Прычым наведваў іх не адзін раз і не два. Тое ж, напрыклад, Селішча было па-свойму прыгожым і раніцай, і вечарам, і летам і зімой. З дапамогай здымка мне хацелася перадаць не толькі прыгажосць, але і драму, якую перажыў тут Купала, калі ў 1902 годзе страціў бацьку, дзвюх сясцёр і брата...

Пашчасціла Анатолю (каб пашчасціла потым іншым...) на дарогі і сцежачкі, па якіх хадзілі класікі, на камяні, дзе яны любілі адпачываць, на крыніцы, з якіх пілі, на туманы, на падмуркі пабудоў, на старэнькія (па цяперашнім часе) хаткі, на дрэвы...

— Хацелася, каб у памяці людзей гэта засталося. — Бо ўсё мяняецца: палі аддаюцца пад садовыя таварыствы, пусткі зарастаюць лесам, выміраюць асобныя вёскі... Але ж ёсць яшчэ людзі, якія могуць паказаць, дзе канкрэтна жылі тыя ж Аўлачынскія, з якіх Купала пісаў Сцяпана Крыніцкага, Паўлінку... Стаіць трохсотгадовы «Ясеў ясень», каля якога паэт любіў збірацца з сябрамі...

Такім чынам, гэты фотаальбом проста закліканы стаць добрым дапаможнікам для тых, хто вывучае творчасць песняроў. І, вядома ж, для тых, хто любіць адкрываць невядомую яшчэ Беларусь. Сакрэт у тым, што галоўныя з адлюстраваных мясцінак Купалы ці Коласа не толькі падпісаныя па-беларуску і па-англійску, але і пазначаны дробнымі лічбамі. Яны, магчыма, не кожнаму зразумелыя. Але той, хто мае машыну са спадарожнікавым навігатарам, па іх адразу ж зарыентуецца: у любы з куточкаў зможа даехаць сам і прывезці на экскурсію іншых...

Як патлумачылі бібліятэкары, у аграгарадках Бярэзіншчыны гэты альбом ужо ёсць. Пасля прэзентацыі ён з'явіўся і ў асобных жыхароў — са словамі ад аўтара: «З надзеяй на прачытанне»... Гэта значыць, на тое, што ўсё напісанае і знятае будзе цікавым і патрэбным — убачаным і пачутым.

Мяркуючы па першых прэзентацыях, спадзявацца на гэта можна.

— Пры ўсёй адрознасці працы гэтых аўтараў — кнігі і альбома — ёсць тое, што аб'ядноўвае іх, — прызнала прысутная на сустрэчы галоўны рэдактар часопіса «Алеся» Тамара Бунто. — Гэта, найперш, высокі прафесіяналізм і любоў да Беларусі, да яе людзей.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Алы АЛЬФЕР.**

***P.S.** Ад рэдакцыі выказваем шчырую ўдзячнасць калектыву бібліятэкі (і ў прыватнасці, загадчыцы аддзела маркетынгу Тамары Мікалаеўне Круталевіч) за бездакорную арганізацыю мерапрыемства, за цёплы прыём. А таксама інтэлігенцыі горада і раёна, падпісчыкам газеты, якія прыйшлі і прыехалі на сустрэчу з вакол, з Беразіно.*



Удзячныя слухачы.

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY
ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY
ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

■ Што людзі пішуць...

# Скарб доўгага веку



Надзея Пракопаўна ЯГОРАВА і Ганна Дзмітрыеўна ГАРАВАЯ.

***— Пагляджу на маміны рукі — схуднелыя, пакручаныя — аж плакаць хочацца! Колькі яны папрацавалі! Дагэтуль далоні ад мазалёў жорсткія, вены набухлыя... Больш за яе ніколі ніхто не зрабіў — ні сярпом, ні матыкай! А колькі яна пагаравала, бедная! Добрае жыццё ў яе, можна сказаць, толькі ў старасці пачалося: 25 снежня сто чатыры гады ёй будзем адзначаць, — расказвае пра сваю матулю, Надзею Пракопаўну Ягораву, жыхарка вёскі Заграмадзіна Шумілінскага раёна Ганна Дзмітрыеўна Гаравая. Ёй самой ужо за восемдзесят, але ні на свой узрост, ні на хваробы яна не зважае, няма як:***

— Бывае так натупаюся, што свет нямілы, — усміхаецца яна. — А тут мама кліча: «Хадзі, пасядзі са мной». Прытуліцца да мяне, просіць прабачэння, што так доўга жыве, маўляў, цяжка мне з ёю. А я пярэчу, кажу: «Не, у мяне таткі не было — дык ты за абаіх жыві, толькі будзь!»

Татку рэпрэсавалі як кулака ў 1932-м, калі той, здавалася, толькі і нажыў, што дачушку. Меліся арыштаваць і маці, таму яна з грудным дзіцем хавалася па вёсках — ад родных да родных... Няк уратавалася, каб ад вяскоўца, што быў схоплены разам з мужам, але ж дадому вярнуўся, пачуць: «Няма твайго. Не чакай».

Гэта быў не апошні ўдар, бо маці выйшла замуж яшчэ раз, аднаго за адным нарадзіла трох хлопчыкаў, ды ўсе яны малымі памерлі, а другі муж загінуў у Вялікую Айчынную.

Яе, гэту вайну, маці і дачка перажылі ў акупацыі, зведаўшы ўсе яе жахі. Не нашмат лягчэй было і вярнуўшыся, бо фашысты спалілі іх родныя хаты і ў Роўным, і ў Запалянцы. Таму, калі немалады мужчына з Заграмадзіна прапанаваў Надзеі жыць разам, тая пагадзілася: займела з дзіцем кут, мужчынскую падтрымку, потым... яшчэ адну дачушку, а следам — чатырох унукаў, пяцярых праўнукаў і ўжо чатырох праправнукаў.

...Мы з Надзеяй Пракопаўнай пазнаёміліся чатыры гады таму. Што здзівіла, у свае сто яна без акуляраў вязала панчохі, чытала газеты, магла па-сучаснаму пажартаваць і выпіць глыток віна за сваё ж здароўе.

Цяпер жыве ў задуменні, у ціхіх успамінах. Бывае, кліча дачку, каб тая дапамагла ёй пачаць вязанне, якога напраўду ў руках няма...

Столькі пражыўшы і перажыўшы, яна ні на што не наракае, за ўсё дзякуе Богу і кожнаму чалавеку зычыць цеплыні і дабрыні — гэткіх жа, якімі яе акружыла дачка. З такім скарбам любы век не ўцяжар.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА. Фота аўтара.**
*г. п. Шуміліна.*

# КАБ ЗАГУЧАЛА...

**...Як хутка ляціць час. Яшчэ крыху — і скончыцца багаты на даты 2012-ы, калі мы адзначалі 130-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, 100-годдзе Максіма Танка, 95-годдзе Янкі Брыля, Пімена Панчанкі, газеты «Звязда», скончыцца Год кнігі. Але ж можна ўжо цяпер гаварыць, што ўдалося зрабіць, а што не.**

Некалі Янка Скрыган сумаваў пра тое, што няма ў нас музея Змітрака Бядулі. Ці хоць бы куточка.

Але ж дзякуючы намаганням многіх людзей з'явіўся такі куточак у вёсцы Корань Капыльскага раёна, і прысвечаны ён памяці самога Янкі Скрыгана.

У мяне асабіста адкрыццё экспазіцыі абудзіла надзею, што беларусы прыгледзяцца да сваіх мясцінак і ў гонар сваіх вядомых землякоў адчыняць нейкія музеі ці хаця б падобныя куточкі, якія будуць працаваць на выхаванне моладзі і да якіх пралягуць сцежкі турыстаў і вандроўнікаў. Бо нам жа ёсць што паказаць! І нам ёсць кім ганарыцца! Але...

У доме 36, што стаіць на рагу сталічных вуліц Энгельса і Маркса, у 50-60 гады мінулага стагоддзя жылі Пятро Глебка, Янка Брыль, Янка Скрыган, Іван Шамякін, Іван Мележ, Васіль Вітка, Іван Навуменка, Максім Лужанін, Уладзімір Караткевіч...

Названых не ўсе прозвішчы, а варта было б назваць! І ўсталяваць на доме, можа нават агульную, памятную дошку — як знак удзячнасці за ўсё, што гэтыя людзі зрабілі для развіцця нашай літаратуры, нашай духоўнасці... Зрэшты, чаму зрабілі, калі іх творы не толькі чыталіся? Яны чытаюцца і будуць чытацца! Прычым не толькі ў нашай краіне, але і далёка за межамі. Аднак мы чамусьці не афішуем гэта, не ганарымся.

...Цяпер мы маем шмат свабоды: кожны робіць, што хоча. Але ж гэта — свабода папугаяў. Для таго, каб загучала родная мова, трэба сур'ёзна брацца за культуру, за наша выхаванне. Вучыць павазе да нашай гісторыі, спадчыны, нашай прыроды, адзін да аднаго. І тады, мне здаецца, не давядзецца плакаць, што мова гіне.

**Уладзімір ГОЛУБЕЎ,** *г. Мінск*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
22 ЛІСТАПАДА 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15708)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Будзем знаёмыя*

Паліна Рэспубліка:

# «Каб усё атрымлівалася, сэрцы павінны біцца ў такт»



**Той факт, што яна сёння на сцэне, Паліна Паланейчык успрымае як выпадковасць. Але як бы там ні было, яе песні — гэта свет глыбокіх пачуццяў. Часам здзіўляешся, што такія тэксты напісаны рукой 18-гадовай дзяўчыны. Не раз параўноўвалі і з Земфірай, і з Алінай Арловай, але яна — Паліна Рэспубліка. Нават яе творчы псеўданім падкрэслівае яе выключнасць і незалежнасць. Для Паліны кожны канцэрт — гэта сустрэчы з тымі, каму патрэбна яе творчасць.**

**— Паліна, вы нарадзіліся ў Мінску. Давайце перанясемся ў гады вашага дзяцінства...**

— У дзяцінстве я была вельмі актыўнай дзяўчынкай. Мая бабуля спявала ў хоры, таму я ведала шмат яе песень, і заўсёды, калі мы, напрыклад, ехалі на вёску, я ладзіла ў электрычцы канцэрты. На нейкіх дзіцячых святах я таксама нешта спявала. Нават памятаю, як па заканчэнні дзіцячага садка мы паставілі «Муху-Цакатуху», дзе мне далі галоўную ролю, і я вельмі гэтым ганарылася. Пазней у школе мяне заўважыла кіраўнік хору.

**— А сябры з тых часоў засталіся?**

— Мая лепшая сяброўка. Лічу, вельмі важна мець у сваім жыцці людзей, якія цябе добра ведаюць, побач з якімі ты можаш адчуць сябе тым, кім быў раней. І я шчаслівая, што побач са мной ёсць людзі, якія памятаюць мяне на розных этапах майго сталення. З іншага боку, я вельмі ўдзячна творчасці за тое, што яна прывяла ў маё жыццё вельмі шмат новых, добрых і цікавых людзей, якіх я таксама магу назваць сваімі сябрамі.

**— Што стала пунктам адліку, з якога пачалася ваша музычная творчасць?**

— Песні з'явіліся нечакана. І для мяне гэта было пэўным цудам. Так, я спявала ў школе, але ні я сама, ні мае бацькі — ніхто не ставіўся да гэтага сур'ёзна. А пасля нарадзілася першая песня, але я не надала гэтай падзеі асаблівай увагі. Нават калі нехта казаў, што песня добрая, мне здавалася, што людзі так кажуць, каб не пакрыўдзіць мяне. Аднойчы я паўдзельнічала ў конкурсе «Срэбныя струны» (тады я толькі навучылася іграць на гітары) і перамагла. Ён праходзіў у два этапы. Паміж этапамі быў цэлы месяц, і тады я напісала другую песню. Што цікава, з гэтымі ж песнямі праз два гады я перамагла на «Бардаўскай восені». Пасля паўтара года была занятая школай і паступленнем. Улетку я нікуды не выязджала, а даведаўшыся, што паступіла, адчула, што надышла другая хваля, і... зноў пачала пісаць песні.

**— Для некага музыка — гэта прафесія, для кагосьці — хобі. Якое тваё асабістае азначэнне музыкі?**

— У мяне стаўленне да музыкі як да чалавека. Музыка для мяне — гэта хвароба, гэта каханне. Я часам разумею, што не магу не спяваць, бо ў гэтым маё самае вялікае шчасце і самае вялікае гора, бо мне добра, пакуль музыка са мной. У мяне быў такі перыяд, калі я напісала з дзясятак песень, але потым была працяглая паўза, і мне ўжо здалося, што я нічога больш не напішу, а тое, што напісала, — напісала не я. І гэтае адчуванне не тое каб здрады, проста вельмі непрыемнае. Сапраўднае ўнутранае спустошанне. У чымсьці музыка для мяне хобі, а ў нечым — праца... Трэба пастаянна выходзіць на новы прафесійны ўзровень. І нават не дзеля кагосьці, а дзеля сябе.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

*Свая справа*

# ОФІС БЕЗ ВОКНАЎ І ДЗВЯРЭЙ,

## або Як маладому чалавеку адкрыць сваю справу?

### Экскурсія па інкубатары малога прадпрымальніцтва



Фота Настассі ХРАЛОВІЧ.

**Распачаць свой уласны бізнэс з нуля — ідэя, якая для многіх маладых так і застаецца толькі ідэяй. Напрыклад, арэнда памяшкання для офіса і паслугі некаторых спецыялістаў каштуюць вельмі дорага. Але ці могуць гэтыя і іншыя фактары замінаць чалавеку, які сапраўды хоча рабіць нешта сваё? Менавіта для такіх людзей і існуе ў сталіцы інкубатар малога прадпрымальніцтва. Не, там не вырошчваюць куранят, хаця нейкія паралелі знайсці можна...**

Вуліца Чапаева — у цэнтры Мінска, зусім недалёка ад плошчы Перамогі. У будынку, які мала нагадвае штосьці звязанае з бізнэсам, месціцца КУП «Моладзевая сацыяльная служба», на базе якога і працуе вышэйназваны інкубатар. Генеральны дырэктар прадпрыемства Рыма ЕПУР адразу ж бярэ ініцыятыву ў свае рукі і адпраўляе журналістаў на імправізаваную экскурсію па інкубатары. Усе пытанні — пасля. Жалезная хватка бізнэсмена адчуваецца з першай хвіліны...

Наш экскурсавод — Маргарыта КАЗАК, памочнік генеральнага дырэктара, такая ж маладая дзяўчына, як і ўсе, хто працуе побач з ёй.

— Бізнэс-інкубатар вядзе працу ў двух кірунках: ён аб'ядноўвае маладыя кампаніі па відах дзейнасці і прапануе выгадныя ўмовы для іх працы, — расказвае яна. — Першапачаткова гэта могуць быць офісы фармату «оўпэн-спэйс».

Трапляем у першы пакой, дзе і месяцца гэтыя самыя офісы. Напэўна, офіс — занадта гучнае слова для таго, што можна ўбачыць тут. Гэтак звычайна выглядаюць працоўныя месцы ў вялікіх кампаніях: шчыльна размешчаныя ў памяшканні сталы з камп'ютарамі і крэсламі. Размяжоўваюцца паміж сабой яны невялікімі перагародкамі, сантыметраў па 20 у вышыню (каб не спісвалі?). Кожнае месца ў 5 квадратных метраў — асобны офіс. Уся дакументацыя захоўваецца на вялікіх стэлажах уздоўж сцяны. Ва ўсіх уласныя паліцы.

— Тут размяшчаюцца кампаніі, якія аказваюць паслугі насельніцтву, — працягвае Маргарыта, — кансалтынг, грузаперавозкі, вучэбныя цэнтры. Усе кампаніі могуць карыстацца перагаворнай па запісе. Калі трэба правесці нейкія перамовы — яны адбываюцца менавіта там. Тым самым кампаніі эканомяць свае сродкі: не трэба здымаць асобнае памяшканне, арэнда выйдзе значна танней.

...Трапляем у падобнае да першага памяшканне. Працоўныя месцы тут значна большыя за тыя, што мы бачылі раней. Усё гэтак жа: стол, камп'ютар, аднак размежавальнікам ім служаць вялікія і доўгія шафы з двух бакоў. Атрымліваецца гэткі закуток плошчай метраў 6-8. Офіс без вокнаў і без дзвярэй — здаецца, не лепшы варыянт. Але ёсць тут і свае плюсы.

— Гэта IT-інкубатар, — працягвае Маргарыта, — тут працуюць кампаніі, у той ці іншай ступені звязаныя з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Больш вялікія памяшканні звычайна ў тых, хто даўно і паспяхова працуе. «Навічкі» пачынаюць працаваць у маленькіх офісах. Людзей тут зараз няшмат. Яны не абавязаны з'яўляцца на працу кожны дзень, ва ўсіх вольны графік.

Рухаемся далей, у арт-інкубатар. Праходзім побач са швейным цэхам. Адна з кампаній наладзіла вытворчасць у самім будынку. Макеты вопраткі супрацоўнікі ствараюць сваімі рукамі. Самі яе і шыюць.

— А дзе можна пазнаёміцца з вынікамі творчасці? — пытаемся мы.

— На мне. Сваю сукенку я набыла ў гэтай фірме, — усміхаецца Маргарыта.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

# ЦІ ТАКОЕ БЕСКЛАПОТНАЕ СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ?

**Калі, нарэшце, кожны іншагародні студэнт зможа разлічваць на гарантаванае месца ў студэнцкім інтэрнаце? Ці ёсць надзея на вяртанне льгот на праезд навучэнскай моладзі ў гарадскім пасажырскім транспарце? Як падтрымаць студэнтаў платнай формы навучання, якія падчас вучобы страцілі апошняга са сваіх бацькоў? Калі крэдыты на навучанне стануць больш даступныя для беларускіх сем'яў? Гэтыя і многія іншыя пытанні ўзнімаліся на VII з'ездзе Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, які прайшоў днямі ў сталіцы. У радах Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі налічваецца амаль 180 тысяч студэнтаў і навучэнцаў, менавіта таму пытанні сацыяльных гарантый навучэнскай моладзі заўсёды былі ў цэнтры ўвагі яго кіраўніцтва...**

— Сёння прыкладна кожны другі навучэнец атрымлівае платную адукацыю. І хоць плата за навучанне пастаянна расце, але па многіх спецыяльнасцях рэнтабельнасць ужо дасягнула нулявога паказчыка. Відаць па ўсім, настаў момант перагляду ўмоў крэдытавання на гэтыя мэты, паколькі крэдытныя абавязацельствы сталі непад'ёмнымі для многіх, — лічыць **старшыня Цэнтральнага камітэта прафсаюза Аляксандр БОЙКА**. — Можна звярнуць увагу на міжнародны досвед у гэтай сферы. Напрыклад, у Аўстраліі па крэдытах на адукацыю прадугледжана нулявая стаўка. У Бельгіі пагашэнне крэдыту распачынаецца праз два гады пасля заканчэння навучання, а на вяртанне ўсіх грошай выпускніку ВНУ даецца да 15 гадоў. Аналагічныя нормы прадугледжаны паўсюдна. Напэўна, і нам можна было б пазычыць з чужога досведу хоць штосьці і адцягнуць вяртанне грошай за навучанне ў часе.

Яшчэ адна праблема — атрыманне кампенсацыі за наём жылля навучэнцамі пры немагчымасці прадастаўлення ім месца ў інтэрнаце. Сёння прыкладна кожны трэці студэнт ВНУ, якому патрэбны дах над галавой, вымушаны самастойна вырашаць праблемы з жыллём на час свайго навучання. Доўгі час кампенсацыя за арэнду студэнтамі жылля складала ўсяго 25% базавай велічыні, таму ніхто з іх не быў у ёй зацікаўлены. Аднак летась, нарэшце, памер кампенсацыі быў павялічаны. У Мінску размова ідзе пра тры базавыя велічыні. І дзве базавыя велічыні складае грашовая кампенсацыя ў іншых населеных пунктах. Але ўмовай для прадастаўлення кампенсацыі стаў як пэўны ўзровень даходаў сям'і студэнта, так і наяўнасць дагавора найму жылога памяшкання. Паводле інфармацыі прафсаюза, на сярэдзіну 2011/2012 навучальнага года ў сталічных ВНУ сістэмы Міністэрства адукацыі гэтай кампенсацыяй змаглі скарыстацца ўсяго 29 чалавек, хоць тых, хто мае патрэбу, зразумела, значна больш.

На сайце Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі было праведзена апытанне, падчас якога высветлілася, што дагавор найму памяшкання маюць толькі крыху больш як 20 працэнтаў студэнтаў, якія здымаюць жыллё. Як правіла, гаспадары жылля не імкнуцца заключаць са сваімі кватарантамі афіцыйны дагавор. Лічым, што з двух крытэрыяў для выплаты кампенсацыі трэба пакінуць толькі адзін — пэўны ўзровень даходаў сям'і.

Але ёсць і іншы погляд на гэтую праблему.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

# ЦІ ТАКОЕ БЕСКЛАПОТНАЕ СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Новы інтэрнат для студэнтаў БДУІР у Студэнцкай вёсцы разлічаны на размяшчэнне 969 чалавек.

*Усім вядома, што малады спецыяліст, які прыбыў па месцы размеркавання, павінен прымацца на ўлік асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без выканання дадатковых патрабаванняў па тэрміне пражывання ў адпаведным населеным пункце. У тым ліку ў Мінску і Мінскім раёне (дарэчы, для людзей, якія прыехалі працаваць у Мінск, гэта дзесяць гадоў пражывання ў сталіцы з моманту рэгістрацыі, а ў Мінскім раёне — пяць.)*

*Але раней узнікалі пытанні з пастаноўкай на ўлік выпускнікоў аспірантуры і дактарантуры, накіраваных на працу ў Мінск. Пасля звароту Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі гэтая праблема вырашылася.*

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Шчыра кажучы, мы ўзрадаваліся, калі з'явіліся, нарэшце, канкрэтныя нарматыўныя дакументы, звязаныя з кампенсацыяй за найм жылля, — падзялілася сваім бачаннем сітуацыі **старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога Марына ПАСТУШЭНКА.** — Нягледзячы на тое, што ў нашай ВНУ, як, напэўна, і ў іншых, створана камісія па гэтым пытанні, за ўвесь час яе работы паступілі ўсяго два звароты ад студэнтаў, але і тыя не здолелі выканаць усе ўмовы для атрымання кампенсацыі. Таму мы лічым, што трэба пакінуць толькі адну ўмову — дагавор найму. У гэтым выпадку работа камісіі стане больш эфектыўнай.

Як вядома, у сталіцы сёння вядзецца будаўніцтва Студэнцкай вёскі. Зусім нядаўна доўгачаканае наваселле справілі студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, а ў снежні будзе адкрыты яшчэ адзін інтэрнат — для студэнтаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. На наступны год запланавана ўвядзенне яшчэ двух інтэрнатаў, а ў 2014 годзе будзе завершана будаўніцтва ўсяго комплексу.

— Але мяркуем, што нават пасля ўводу ў строй усіх аб'ектаў Студэнцкай вёскі ўсё роўна тысячы навучэнцаў будуць вымушаны самастойна вырашаць праблему з пошукам жылля. Таму прафсаюз прапануе прыняць рашэнне аб стварэнні рэальна дзейснага механізму кампенсацыі выдаткаў па найме жылля іншагароднім навучэнцам, — падкрэсліў Аляксандр Бойка. — Нявырашаным застаецца і пытанне льгот на праезд. Станоўчы досвед яго вырашэння можна было б пазычыць у буйных гарадоў Украіны і Расійскай Федэрацыі, дзе студэнтам рэалізуюцца месячныя праязныя білеты са зніжкай у памеры 50%. У ВНУ Кіева распаўсюджваннем такіх білетаў

**Нават пасля ўводу ў строй усіх аб'ектаў Студэнцкай вёскі тысячы навучэнцаў будуць вымушаны самастойна вырашаць праблему з пошукам жылля.**

займаюцца першасныя прафсаюзныя арганізацыі навучэнцаў. Дарэчы, Саветам старшыняў прафсаюзных арганізацый навучэнцаў у 2011 годзе праводзілася сацыялагічнае даследаванне ў сталічных ВНУ па пытанні зацікаўленасці студэнтаў у такіх білетах. Па яго выніках больш як 80% навучэнцаў гатовы набываць месячныя праязныя білеты з 50-працэнтнай зніжкай.

Неаднаразова ўзнімалася галіновым прафсаюзам і праблема матэрыяльнага забеспячэння студэнтаў платнай формы навучання, якія ўжо падчас вучобы страцілі апошняга з бацькоў. Такіх студэнтаў няшмат. Тым не менш за кожным выпадкам стаіць канкрэтны чалавек са сваім лёсам. Перавесці іх на навучанне за кошт бюджэтных сродкаў ці прадаставіць ім зніжку па аплаце за навучанне на працягу года (а зрэдку і па выніках года), магчымасці няма. Галоўнай падставай для пераводу можа быць толькі паспяховасць студэнта, а яна якраз не заўсёды дазваляе гэта зрабіць. Міністэрства адукацыі рэкамендавала рэктарам аказваць студэнтам, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, матэрыяльную дапамогу для кампенсацыі аплаты за навучанне. Аднак тая дапамога, што аказваецца, далёка не заўсёды дазваляе ў поўным аб'ёме пакрыць кошт адукацыйнай паслугі, таму трэба ствараць больш дзейсныя механізмы для выхаду з сітуацыі.

Марына Пастушэнка расказала, што ў сітуацыі, калі многія ВНУ, сутыкнуліся з праблемай зніжэння рэнтабельнасці платнага навучання, прафкаму Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта ўдалося адстаяць пытанні, звязаныя з заахвочваннем і аказаннем матэрыяльнай дапамогі студэнтам, якія навучаюцца за кошт уласных сродкаў. Сёлета толькі за 9 месяцаў была аказана матэрыяльная падтрымка 70 студэнтам на суму больш як 17 млн рублёў, а прэміі атрымалі 90 дастойных студэнтаў-платнікаў на суму больш як 10 млн рублёў.

— Роля нашай прафсаюзнай арганізацыі ў вырашэнні падобных пытанняў самая непасрэдная: старшыня прафкама студэнтаў з'яўляецца членам камісій па матэрыяльным стымуляванні, па пераводзе на бюджэт і камісіі па прадастаўленні зніжак са сфарміраванага кошту платы за навучанне — а такіх студэнтаў у нас у гэтым годзе 45. Да таго ж у ВНУ навучаюцца сіроты — 22 чалавекі. І ўсе яны знаходзяцца на ўліку ў сацыяльнай службы ўніверсітэта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Выбар — зроблены!*

# «СЛЯДЫ» ПРЫВЯЛІ Ў... АКАДЭМІЮ МУС

## Як працуюць крыміналісты? Як выяўляюцца сляды на месцы злачынства? Як складаецца фотаробат патэнцыяльнага злачынцы? Як устроена агнястрэльная зброя?



**Даведацца пра гэтыя і многія іншыя цікавыя рэчы са штодзённага жыцця работнікаў органаў унутраных спраў была магчымасць ва ўсіх, хто ў мінулую суботу прыйшоў у Акадэмію МУС на Дзень адчыненых дзвярэй.**



У маі 2013 года галоўная праваахоўная ВНУ Беларусі адзначыць свой 55-гадовы юбілей, таму ў гэты раз у Акадэміі вырашылі здзейсніць для абітурыентаў невялічкі экскурс у гісторыю: на ўваходзе маладых людзей сустракалі курсанты ў форме стражаў правапарадку розных гістарычных перыядаў. Увазе абітурыентаў былі прапанаваны цікавейшыя выставы зброі і экспертна-крыміналістычныя работы. Але самае галоўнае — у маладых людзей была магчымасць атрымаць інфармацыю аб умовах паступлення ў Акадэмію, так бы мовіць, з самых першых вуснаў. І хоць новая рэдакцыя правілаў паступлення ў ВНУ яшчэ не прынята, тым не менш пра пэўныя асаблівасці будучай прыёмнай кампаніі ў Акадэміі МУС гатовы гаварыць ужо сёння.



Так, напрыклад, у 2013 годзе набор на факультэт права будзе арганізаваны іншым чынам. Прафесіянальны адбор абітурыентаў будзе ажыццяўляцца непасрэдна Акадэміяй МУС, таму медыцынскія патрабаванні да здароўяستануць, як чакаецца, менш жорсткімі. Ахвотныя павінны будуць з 20 лютага да 1 чэрвеня падаць адпаведную заяву ў акадэмію. У той жа час пры паступленні на ўсе іншыя факультэты абітурыенты павінны звярнуцца да 15 красавіка 2013 года з адпаведнай заявай і дакументамі ў органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства. Для асоб жаночага полу на факультэце права не ўстаноўлена ніякіх абмежаванняў па лічбах набору: галоўнае — паспяхова здаць тэсціраванне і вытрымаць конкурс. Але ёсць адна немалаважная акалічнасць: навучанне на факультэце права ажыццяўляецца толькі завочна, прычым на платнай аснове. Са студэнтамі факультэта права не заключаецца кантракт аб службе ў органах унутраных спраў. І тыя маладыя людзі, якія паступяць на факультэт права, будуць не курсантамі, а студэнтамі, якія атрымліваюць адукацыю завочна.



Таксама ў 2013 годзе на факультэце міліцыі будзе праведзены набор на спецыялізацыю «Адміністрацыйна-прававая дзейнасць», у рамках якой ажыццяўляецца падрыхтоўка кадраў для патрэб падраздзяленняў ДАІ. Абітурыенты, якія праходзяць па конкурсе на дзённую форму атрымання адукацыі, залічваюцца ў Акадэмію МУС і прымаюцца на службу ў органы ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. З імі заключаецца кантракт, які прадугледжвае абавязак праходжання службы ў органах унутраных спраў на працягу тэрміну навучання ў Акадэміі МУС, а таксама не менш як пяць гадоў пасля яе заканчэння.

Выпускнікі прававых профільных класаў будуць мець перавагу перад іншымі абітурыентамі пры залічэнні пры іншых роўных умовах...

**Надзея НІКАЛАЕВА. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

# ОФІС БЕЗ ВОКНАЎ І ДЗВЯРЭЙ...

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

У арт-інкубатары ўсё па-іншаму. Офісы тут значна больш упісваюцца ў стандартнае пра іх уяўленне. Гэта ўжо сапраўдныя асобныя памяшканні. З дзвярыма. Прычым некаторыя фірмы займаюць некалькі памяшканняў адначасова. Напрыклад, рэдакцыя сайта месціцца ў адным кабінеце, яго дырэктар, як і належыць, — у другім. Аднак офісы «оўпэн-спэйс» (такія, як у IT-інкубатары) ёсць і тут.

— У арт-інкубатары працуюць людзі творчыя. Таму іх зараз амаль няма на месцах, — зноў смяецца Маргарыта. — Тут цэлая «армія» абсалютна розных фірмаў. Вельмі яскрава ў арт-інкубатары адлюстраваны прынцып супрацоўніцтва без канкурэнцыі. Гэта лёгка заўважыць у офісах «оўпэн-спэйс». Мы нават размяшчаем побач фірмы, якія актыўна дапамагаюць адна адной. Напрыклад, фларысты і фірма, якая займаецца арганізацыяй свят, працуюць побач. Зразумела, што гэта выгадна і першым, і другім. Згадзіцеся, так працаваць не толькі рацыянальней, але і весялей. Ёсць, напрыклад, людзі, якія ствараюць свае сайты. З дапамогай іншай фірмы яны могуць прасунуць гэты сайт, зрабіць сабе візітоўкі, а бухгалтар будзе іх абслугоўваць. Усё ў адным месцы. Не трэба заключаць нейкія іншыя дамоўленасці, далёка ездзіць.

— Мы ўжо бачылі вельмі шмат офісаў. А колькі іх тут усяго?

— У гэтым будынку — больш за 80. У нас ёсць яшчэ адно аддзяленне на вуліцы Казлова, побач. Там сабраны кампаніі ў сферы турызму. Кажуць, нельга аб'ядналь фірмы, якія працуюць з турыстамі, каб яны не канкурыравалі адна з адной. Але гэта няпраўда. Турызм таксама бывае розны: уязны, выязны і гэтак далей. Таму там пануе прыкладна такая ж атмасфера, як і на Чапаева.

Трапляем яшчэ ў адзін офіс, той самы, асобны. У ім працуюць мастакі. Усё навокал застаўлена карцінамі. Офіс упрыгожаны. Малюнак на ўсю сцяну — чым не яскравейшая дэманстрацыя спецыялізацыі гэтай кампаніі?

— Якія паслугі, акрамя здачы памяшканняў у арэнду, можна ў вас атрымаць? — пытаемся мы ў Маргарыты.

— Бухгалтарскія, як я ўжо казала. Тут працуюць індывідуальныя прадпрымальнікі, якія іх аказваюць. Усю адказнасць таксама нясуць яны. У нас заключаны дамовы з прыбіральшчыкамі і грузчыкамі. Таму памяшканні заўсёды чыстыя. Безумоўна, юрыдычныя паслугі. У гэтым будынку працуе і моладзевая біржа працы. Калі, напрыклад, вы адкрываеце кампанію і вам патрэбны супрацоўнікі, біржа дапамажа іх знайсці па зададзеных крытэрыях. Пошук вядзецца па анкетах, але калі вас нічога не задавоrange, то на сайце з'явіцца вакансія. Так вельмі лёгка можна сабраць персанал. Усе будучыя супрацоўнікі пройдуць гутарку спачатку на біржы, а потым і ў вашай кампаніі.


Фота Настассі ХРАЛОВІЧ.

— А якія абмежаванні існуюць для тых, хто хацеў бы адкрыць свой бізнэс менавіта ў вас?

— На нашым сайце mcc.by ёсць спіс дакументаў, якія патрабуюцца пры рэгістрацыі. Ёсць абмежаванні, напрыклад, па сферы дзейнасці. Нельга адкрыць страхавую кампанію (за выключэннем кампаніі-пасрэдніка), кампанію, якая займаецца гульнявым бізнэсам. Таксама мы не размяшчаем у інкубатары канкурэнтныя арганізацыі.


Фота Настассі ХРАЛОВІЧ.

— Ці ёсць вакол інкубатара нейкі ажыятаж? Моладзь ірвецца адкрываць свой бізнэс? Ці асаблівай актыўнасці няма? — задаём на заканчэнне размовы пытанне Маргарыце Казак.

— Скажам так: прыходзяць да нас многія, але людзі вельмі баяцца. Баяцца адказнасці, баяцца пачынаць сваю справу. Але ў тых, хто застаецца, усё атрымліваецца лепшым чынам. Дастаткова сказаць, што сёння ў нас няма ніводнага пустога памяшкання. Выратуе сітуацыю толькі пашырэнне інкубатара яшчэ на два паверхі, якое хутка адбудзецца. Але і на арэнду гэтых памяшканняў ужо сабралася чарга. Увогуле, людзей трэба падштурхоўваць да дзеяння. Мы ім дапамагаем, пазбаўляем гэтага страху, бо іх тут падтрымае цэлая каманда спецыялістаў.

...Перад самым выхадам яшчэ раз заходзім да генеральнага дырэктара прадпрыемства Рымы Епур.

— Сутнасць нашай дзейнасці — у яе часовым характары. Мы гадуем прадпрымальнікаў, як у школе. Тут яны працуюць тры гады, а потым мы іх адпускаем у вольнае плаванне. Першы год яны плацяць 50% ад кошту ўсіх паслуг, другі — 75%, трэці — 100%. Яны паспяваюць стаць на ногі і адчуць смак сваёй дзейнасці. Гэта датычыць усіх людзей, якія тут працуюць, у тым ліку і маю памочніцу Маргарыту, якая была сёння вашым экскурсаводам. Яна тут даўно, яна вырасла, стала прафесіяналам. І для яе таксама надышоў час ісці далей. У гэтым і заключаецца наша роля: паставіць на ногі і даць магчымасць і жаданне рухацца далей.

## ЦІ ХАЦЕЛІ Б ВЫ ЗАНЯЦЦА ЎЛАСНЫМ БІЗНЭСАМ?



**Павел ДЗЯВЯТАЎ, распрацоўшчык сайтаў:**

— Пасля заканчэння ўніверсітэта я планую адкрыць свой і бізнэс і ўжо даведаўся, як праходзіць працэдура рэгістрацыі ІП. Адкрыццё — працэдура простая. Весці бухгалтарскую дзейнасць таксама не будзе складана. Палохаюць толькі высокія падаткі, з-за якіх выйсці на рэнтабельны ўзровень даволі цяжка. На маю думку, для маладых прадпрымальнікаў павінны дзейнічаць пэўныя льготы на падаткі хоць бы на першы час.



**Марыя БАТЦ, студэнтка БДУ:**

— Уласную справу трэба пачынаць тады, калі ў цябе ёсць стартавы капітал альбо ты ведаеш, як яго знайсці. Бываюць выпадкі, калі чалавек ведае, як пачаць уласную справу, але ў яго няма магчымасці. А ўмешвацца ў справу іншых людзей не хочацца, бо яны могуць знішчыць «мару ўсяго жыцця» сваімі патрабаваннямі. Таму прасцей пакінуць ідэю марай... Хоць бываюць і шчаслівыя! Сваю справу пачаць хацелася б, але я думаю, што мне не хапае для гэтага вопыту.



**Пётр ЗАКРЭЎСКІ, студэнт БНТУ:**

— Страху асаблівa ніякага няма. Чаго тут баяцца? Узяў ды і адкрыў, цяжка іншае — пратрымацца на плаву і развіць гэты бізнэс у нешта большае. Зарабляць вялікія грошы можна і звычайным «клеркам». Калі ўмееш прымусіць людзей купляць тое, што прапануеш, — гэта поспех. І прыбытак адпаведны. Для таго, каб атрымалася нешта сапраўды вартае, трэба ўкласці вельмі шмат сіл, ды і грошай, безумоўна. З нуля, без капейкі ў кішэні гэта немагчыма.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*«100 ідэй для Беларусі»*

# Ідэі сёння — увасабленне заўтра

**У свой час, калі праект Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «100 ідэй для Беларусі» толькі задумваўся, ніхто не мог прадбачыць, якую вялікую цікавасць ён выкліча сярод маладых людзей. Але прайшоў ужо больш як год, а заяўкі ўсё яшчэ паступаюць. Зразумела, што заявіць пра свае ідэі — гэта толькі першы крок.**

Ідэі былі самыя розныя, цікавыя і неверагодныя, але шанц на ўвасабленне быў найперш у тых, якія адпавядалі крытэрыям інавацыйнасці, рэалістычнасці і магчымасці практычнага выкарыстання. Шукалі свежыя думкі, але часам траплялі на сурагат, бо ў век інтэрнэту ідэю можна ў кагонебудзь «пазычыць».

— Мы з самага пачатку не імкнуліся знайсці нейкую суперідэю, якая б вывела чалавецтва на новы ўзровень развіцця, — усміхаецца **старшыня Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ Яўген ГАЛІН**. — Галоўным для нас было актывізаваць моладзь. І, як вынік, зараз у нашай базе даных не менш за паўтары тысячы ідэй, якія маюць нешта адметнае. Праекты, так бы мовіць, на самы розны густ: звязаныя з навукай, гісторыяй Беларусі, інтэрнэтам і камп'ютарнымі тэхналогіямі, турызмам, здаровым ладам жыцця, праекты сацыяльнай накіраванасці.

Азнаёміцца са скарбніцай прапаноў ад беларускай моладзі можна на сайце БРСМ, у сацыяльных сетках ці наведаўшы выставы, якія ладзяцца як на рэгіянальным, так і на рэспубліканскім узроўні.

Калі вандроўкі для вас — гэта стыль жыцця, вам, напэўна, будзе цікава даведацца пра «Віртуальнае падарожжа па «Залатым замкавым кольцы». Ідэя праекта заключаецца ў тым, каб пры дапамозе 3D-мадэлявання стварыць праграму візуалізацыі замкаў і панарамных відаў Беларусі. Гэта дазволіць любому ахвотнаму вандраваць па Беларусі, нават не выходзячы з дому.

— Ідэя ўзнікла яшчэ падчас выкання дыпломнага праекта адным з нашых суаўтараў, калі вялася рэканструкцыя Лідскага і Косаўскага замкаў. Пасля гэтага нам падалося, што неабходна развіць гэтую ідэю, — кажа аўтар Дзмітрый Прадун. — Зараз мы актыўна спрабуем знайсці спонсараў, бо менавіта недахоп фінансавання перашкаджае рухацца рабоце над праектам наперад. Трохузроўневае мадэляванне, паездкі, якія дазволяць атрымаць доступ да архіўных дакументаў, правядзенне замераў архітэктурных помнікаў — усё патрабуе сродкаў. Тым больш што зараз мы спрабуем крыху пашыраць свае гарызонты даследавання і ахапіць не толькі замкі Беларусі, але і іншыя архітэктурныя помнікі.

Хочацца верыць, што знойдуцца тыя, каго зацікавіць ідэя віртуальнага турызму...

Праблема фінансавання актуальная для любога праекта, але немалаважную ролю адыгрывае і жаданне гарадскіх улад падтрымаць праекты маладога пакалення — напрыклад, праект «Паратурызм для інвалідаў». Адзін з яго ініцыятараў расказаў, што штуршком для іх стаў досвед замежных краін, дзе інваліды не адчуваюць дыскамфорту і перашкод, калі ім хочацца прагуляцца па парку ці наведаць кавярню. У Мінску для такога адпачынку, на жаль, умовы не створаны. А было б добра распрацаваць турыстычныя маршруты ў горадзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, каб тыя маглі самастойна ці ў суправаджэнні праехацца па любімым парку, паглядзець навінку ў кіно ці тэатры альбо сустрэцца з сябрамі ў кавярні.

— Безумоўна, нам неабходна фінансаванне і падтрымка, а ў горадзе ўсё робіцца толькі са згоды «зверху», — разважае аўтар Уладзімір Валасных. — Калі мне даводзілася бываць у іншых краінах, то я бачыў, што ў людзей на інвалідных калясках ёсць магчымасць адпачываць у парках, скверах, на пляжы. А вось, пражыўшы ў Мінску каля шасці гадоў, я такіх людзей у горадзе не сустракаў.

Таксама хлопец сумесна са сваімі аднадумцамі распрацаваў знак «Даступнае месца». Добра было б, каб такія знакі размяшчаліся менавіта ў тых месцах, дзе турысту-інваліду патрэбны арыенцір і ўпэўненасць, што там яго не чакае чарговая перашкода.

Арыгінальнай падаецца і ідэя студэнткі Дар'і Трыгубавай, якая жыве мэтай стварыць у Мінску дзіцячы музей.

— Калі я была маленькай і трапляла ў музей, то мне заўсёды хацелася дакрануцца да экспанатаў. І шкло, за якім яны знаходзіліся, было для мяне перашкодай, — дзеліцца Даша. — Таму мне падаецца, што добрая ідэя — прыбраць гэтыя перашкоды і дазволіць дзецям даследаваць рэальнасць. У музеі можна будзе ўсе экспанаты браць у рукі, і будуць людзі, якія змогуць патлумачыць, для чаго тая ці іншая рэч прызначана і як яе выкарыстоўваць. Напаўненне залаў будзе змяняцца ў залежнасці ад попыту і зацікаўленасці наведвальнікаў.

Пакуль адны яшчэ змагаюцца за свае мары і задумы, іншыя — ужо рэалізоўваюць свае ідэі. Як прыклад, праект Яніны Каляды «Вырасцем разам», які звяртае ўвагу на ролю бацькі ў выхаванні дзіцяці. Праект уключае шэраг мерапрыемстваў, якія б дазвалялі далучаць мужчын, якія маюць сям'ю, да выхавання. Было праведзена анкетаванне з мэтай выявіць, ці з'яўляецца сёння гэтая з'ява сацыяльнай праблемай, ці ўсведамляюць таты сваю адказнасць і значэнне сваёй ролі ў жыцці дзіцяці. А на базе мінскага дзіцячага садка № 111 была пасаджана «Бацькоўская алея». Сёння ў рамках праекта праводзіцца конкурс сацыяльных праектаў і білбордаў па тэматыцы бацькоўства і ролі ў ім мужчыны. Па завяршэнні конкурсу напрыканцы года ёсць прапанова адабраць лепшыя плакаты для распаўсюджвання іх у навучальных установах і ўстановах аховы здароўя.

Зараз у БРСМ думаюць над тым, каб «Сто ідэй» адпусціць у бестэрміновае плаванне: калі людзям ёсць што сказаць, то трэба, каб была пляцоўка, дзе ў іх будзе магчымасць выказаць свае думкі ўслых ці нават атрымаць шанц на рэалізацыю сваёй ідэі. А «Чырвонка» адпраўляецца на сустрэчу з новымі героямі праекта «100 ідэй для Беларусі». Хто ведае, можа, ім будзеце вы?

**Алена ДРАПКО.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
22 11 2012 г.

# ЧАМУ Ж НАМ НЕ ПЕЦЬ?

**Артысты, якім пашчасціла прабіцца ў фінал нацыянальнага адбору, рэпеціруюць практычна штодня. Тэлевізіёншчыкі шліфуюць творчыя і тэхнічныя моманты будучага шоу. Праўда, ніякіх падрабязнасцяў юбілейнага — дзясятага па ліку — фіналу нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» ў Белтэлерадыёкампаніі не раскрываюць. «Сакрэт, сакрэт, вялікі сакрэт», — адказвае на ўсе роспыты кіраўнік сёлетняга адбору, намеснік галоўнага дырэктара тэлеканала «Беларусь 2» Вольга Шлягер. Дазнацца ўдалося толькі, што ніводны з 10 фіналістаў коней на пераправе — у сэнсе, конкурсныя песні — не мяняў. Дакладней, арганізатары не прапаноўвалі нікому гэта зрабіць. А значыць, на канцэрце 7 снежня прагучаць ужо добра «абкатаныя» і выверaныя да апошняй ноткі песні. Хочацца спадзявацца, што сярод іх будзе тая адзіная, пасля якой мы дружна скажам «Ах!» і схопімся за тэлефоны — галасаваць. А перад тым нялішне б пазнаёміцца бліжэй з прэтэндэнтамі: сярод каго, уласна, выбіраць будзем?**



## ВІТАЛЬ ВАРАНКО, «I wonder how you»

Трэцякурснік Акадэміі музыкі і чарговы падапечны прадзюсара Уладзіміра Кубышкіна — на сцэне далёка не навічок. Проста вядомы ён слухачам найперш як баяніст (або, як сціпла адзначана ў біяграфіі двойчы стыпендыята Прэзідэнцкага фонду РБ па падтрымцы таленавітай моладзі, «баяніст-віртуоз і музычны феномен»). У рэпертуары Віталя знайшлося месца як творам Баха, Паганіні і Астара П'яцолы, так і хітам «Бітлз», блюзам Рэя Чарлза і джазавым п'есам. У якасці музыканта за апошнія 4 гады хлопец мае ўжо досыць узнагарод і шырокую канцэртную геаграфію (Расія, Украіна, Польшча, Літва, Італія, Германія...) На цярністую сцежку шоу-бізнэсу Віталь Варанко ступіў летась, калі са сваім электронным белым баянам знакамітага брэнда «ZONTA» спрабаваў «парваць» тэлешоу «Акадэмія талентаў». Там яго заўважыў і ўзяў да сябе вопытны прадзюсар Кубышкін, пачаўшы раскручваць новага Варанко — аўтара і выканаўцу. Уласна, конкурсную песню для «Еўрабачання» Віталь таксама напісаў сам.

## АЛЕНА ЛАНСКАЯ, «Rhythm in Love»



Трэцяя прадстаўніца ПЦ «Спамаш» і ўсяго другая дзяўчына ў фінале адбору-2013. Гэтую яркую бландзінку двойчы прадстаўляць не трэба, таму ўзгадаем хіба што найбольш яркія моманты з творчай біяграфіі артысткі. Уладальніца Гран-пры леташняга XX «Славянскага базару ў Віцебску». Самая маладая заслужаная артыстка Беларусі. Мала таго, што Алена — спявачка і прыгажуня, яна яшчэ спартсменка (падчас здымак рэаліці-шоу «Цудоўная сямёрка» дзяўчына, якая дагэтуль ледзь стаяла на лыжах, за пару тыдняў засвоіла такі няпросты від спорту, як біятлон). Фіналістка леташняга беларускага адбору на «Еўрабачанне» — ды што там, некалькі дзён Алена Ланская нават прахадзіла ў пераможцах! Аднак пасля гучнага скандалу з падтасоўкай галасоў без лішніх слоў саступіла першае месца гурту «Litesound». На «Еўрабачанне», зрэшты, артыстка з'ездзіла — у якасці балельшчыка. А сёлета з новай песняй, прыдбаным вопытам і свежымі сіламі робіць другую спробу. Да падрыхтоўкі падыходзіць вельмі адказна і стараецца выкарыстоўваць усё найлепшае: калі ўбор — то ад вядомага дызайнера Ганны Драгацэннай, калі імідж — то ад не менш вядомага стыліста Аляксандра Кірынюка... Цікавая дэталь: у каманду Алены сёлета ўваходзіць прадзюсар Дзмітрый Баранаў — той самы, што ў выніку леташняга скандалу быў прызнаны вінаватым і звольнены з БТРК.



## АЛЯКСЕЙ ГРОС, «One Way Love»

Наш адказ Рыкі Марціну — «беларускі мачо» Аляксей Грос, калі прыгледзецца, таксама аказваецца не тое каб незнаёмцам. Яшчэ мінулай вясной артыст быў заўважаны на беларускім этапе адбору «Новай хвалі». Праўда, на вышэйзгаданы музычны конкурс ураджэнец Салігорска не трапіў, але і ў нікуды не знік. Падпісаўшы дамову з прадзюсарскім цэнтрам «Спамаш», Аляксей пад новым сцэнічным іменем пачаў рабіць кар'еру эстраднага спевака. І, трэба сказаць, вельмі паспяхова: пасля «Музычнага форуму» ў Салігорску ўзяць адразу фінал нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» — гэта і больш вопытным калегам па цэху, якія змянілі не адзін творчы псеўданім, не заўжды ўдавалася...



## NUTEKI, «Save me»

Адкрыццё леташняга беларускага адбору на «Еўрабачанне», мінска-маскоўскі гурт «Nuteki» насамрэч існуе ўжо 4 гады, а фронтмены Міхаіл Накарашвілі і Кірыл Мацюшэнка займаюцца музыкай і яшчэ даўжэй. Аднак ранейшы сцэнічны досвед, што б там ні сцвярджалі сябры і калегі музыкантаў, шырокага поспеху не меў — клубныя канцэрты, не больш. Тады хлопцы вырашылі пайсці па накатаным шляху, што называецца, «праз Маскву», і ўжо адтуль пачалі ўпэўненае шэсце па гарадах Расіі, Беларусі і Украіны. Цяпер у актыве гурта — два альбомы, некалькі адзначаных рознымі прызамі кліпаў, нетутэйшы лоск і вялікія планы на будучыню. А паралельна з падрыхтоўкай да фіналу беларускага адбору на «Еўрабачанне-2013», не губляючы часу, калектыў гастралюе па Расіі і Еўропе, зімой збіраецца ў ЗША.



## МАКС ЛОРЭНС, «I love your charming eyes»

Гэты артыст у доўгіх прадстаўленнях таксама не мае патрэбы. Першы беларускі пераможца «Славянскага базару ў Віцебску» (2003 год), удзельнік праектаў знакамітага рэпера Сярогі, удзельнік конкурсу «Новая хваля-2009», фіналіст расійскага адбору на «Еўрабачанне», ураджэнец Гомеля Максім Сапацькоў, ён жа Макс Лорэнс, у беларускай музычнай тусоўцы цяпер не самы часты госць. Вось і да фінальнага адборачнага канцэрту, як расказаў прадзюсар Валерый Шоман, Макс рыхтуецца ў пастаянных пералётах адначасова ў двух месцах — нямецкай кампаніі, якая робіць звядзенне і мастэрынг конкурснай песні, і гомельскай «Студыі 7», якая выступае рэпетыцыйнай базай і пастаўшчыком бэк-вакалістаў. «Наш нумар не прадугледжвае нейкай там падтанцоўкі, упор робім на прафесійнае выкананне якаснай песні», — падзяліўся прадзюсар.

## ДАРЫЯ, «Catch Me Again»



І зноў прывітанне прадзюсарскаму цэнтру «Спамаш» — менавіта ў ім практычна з моманту заснавання (лічы, 7 гадоў) працуе гэтая спявачка. Хоць насамрэч сцэнічнае жыццё Дарыі пачалося значна раней — з першага буйнога рэгіянальнага конкурсу «Адна зямля» ў 2000 годзе. Можна прыгадаць і ўдалае выступленне на міжвузаўскім конкурсе прыгажосці «Каралева Вясна-2002», калі дзяўчына ўпэўнена дайшла да фіналу расійскага тэлепраекта «Народны артыст-2» у 2004-м. Прыкладна праз год спявачка Дар'я Урызчанка трансфармавалася проста ў Дарыю і разам з іншымі «спамашаўцамі» пачала кампанію па заваяванні айчынных слухачоў. Потым, у 2008-м, быў мюзікл «Байкер» і проба сябе ў якасці актрысы. Цяпер Дарыя сумяшчае тры іпастасі — спявачка, актрыса і, між іншым, маладая маці — што не перашкаджае ёй з падвоенай энергіяй выступаць і здымацца ў тэлепраграмах.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
22 11 2012 г.



# Праз два тыдні вызначыцца прадстаўнік Беларусі на конкурсе «Еўрабачанне-2013»



## UZARI, «Secret»

Прадстаўнік Беларусі на конкурсе «Новая хваля-2011», удзельнік «Еўрабачання-2011» (у якасці бэк-вакаліста Анастасіі Віннікавай), фіналіст леташняга адбору на «Еўрабачанне», спявак Uzari (ён жа Юры Наўроцкі) — музыкант у трэцім пакаленні. Мама, Галіна Грамовіч — салістка Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, тата скончыў кансерваторыю па класе трубы, дзядуля — вакаліст-«народнік», вучыўся ў тым жа Пецярбургскім універсітэце культуры і мастацтваў, што і ўнук... А ўнук пайшоў далей — і ў музычных стылях, і ў прафесійных інтарэсах. Сёння Юзары — спявак і кампазітар, паэт і акцёр мюзіклаў. І кропка ў гэтым пераліку стаіць выключна з-за маладога ўзросту артыста.

## ЯNKEY, «Letter to Mother»

Саліст і, уласна, стваральнік гурта Ян Жэнчак у нацыянальным адборы на «Еўрабачанне» робіць стаўку адразу на некалькі фактараў. Па-першае, уласная харызма і адпаліраваны «песняроўскай» школай вакал (з 2004-га па 2008 год Ян выступаў у складзе ансамбля «Песняры» пад кіраўніцтвам Леаніда Барткевіча, а ў 2009 годзе ўжо ўдзельнічаў у «Еўрабачанні» — у якасці бэк-вакаліста яшчэ аднаго экс-«Песняра» Пятра Ялфімава). Па-другое, сцэнічны вопыт, памнажаны на рокавы драйв. Нарэшце, трэці фактар — віртуозныя рыфы гітарыста Дзмітрыя Мікуліча. Астатняе хлопцаў, напярэдадні фіналу, здаецца, не хвалюе. Ці можа, проста яны вельмі ўмела робяць выгляд.





## BEAVER BAND, «Incredible Girl»

У кожным конкурсе павінен быць свой джокер. На сёлетнім адборы гэта мала каму вядомы гурт, названы практычна іменем свайго стваральніка — выкладчыка музыкі Сяргея Бабровіча.

Сам калектыў падобны да жывой ілюстрацыі ансамбля «Вечная маладосць». Толькі замест хрэстаматыйных «гітары — рытм, сола і бас, і, безумоўна, і сінтэзатара» тут у складзе гучаць гітара, трамбон і кантрабас. А ўласна конкурсны нумар — адзін суцэльны жарт і самаіронія, чаго так часта не хапае іншым беларускім «еўрабачанцам». Асноўная падрыхтоўка да фінальнага выступлення для ўдзельнікаў гурта — гэта павышэнне ўзроўню валодання англійскай мовай (той, хто ў школе вучыў нямецкую, зразумее, у чым цяжкасці) і мінхранізацыя адмысловага «бабровага танца». Усё астатняе — настрой, імпэт і абаянне — у калектыву і без таго ёсць.



## САЦУРА, «Get out of my way»

Яшчэ адзін экс-гамяльчанін і, што адметна, «аднакашнік» папярэдняга артыста па многіх музычных праектах. Але хлопцы даўно ўжо не бачыліся, не кантактавалі і выступаюць сёлета ў якасці паўнацэнных сапернікаў.

Сын вядомага беларускага кампазітара, музыкальнага кіраўніка ВІА «Сябры» Мікалая Сацуры, Станіслаў займаўся музыкай з дзяцінства, а першы свой гурт арганізаваў ужо ў 12 гадоў. Пазней працаваў на бэк-вакале ў рэпера Сярогі, запісаў сольны R'n'B-альбом, паспрабаваў (і даволі паспяхова) сябе ў якасці кінаакцёра.

У адборы, сцвярджае Стас, ён вырашыў паўдзельнічаць, бо сябры ўпікнулі — беларус, а ў роднай краіне ніяк сябе не праяўляе. «Я падрыхтаваў добрую, моцную песню», — сціпла каментуе артыст сваю пазіцыю.

*Такім чынам, сярод 10 фіналістаў мы ўбачым усяго 2 дзяўчат і не пачуем (на жаль) ніводнай беларускамоўнай песні. Што ж, давядзецца выбіраць з таго, што ёсць.*

*Тым часам стала вядома, што правілы «Еўрабачання-2013», якое пройдзе налета ў шведскім горадзе Мальмё, істотна змяніліся. У студзені адбудзецца папярэдняе лёсаванне, якое падзеліць краіны-ўдзельніцы па 2 паўфіналах і назаве толькі адзін парадкавы нумар — краіны-арганізатара. Чарговасць выступленняў усіх астатніх канкурсантаў вызначаць самі прадзюсары конкурсу. Такім чынам, арганізатары збіраюцца ператварыць працэдуру абвяшчэння парадкавых нумароў у асобнае яркае тэлешоу.*

*Папярэдне прынята рашэнне, што Швецыя, Данія і Нарвегія будуць выступаць у розных паўфіналах. Інакш, маўляў, асноўную масу білетаў набудуць гледачы з гэтых суседніх краін, астатняя ж публіка сутыкнецца з дэфіцытам квіткоў.*

***Вікторыя ЦЕЛЯШУК, фота БЕЛТА і з адкрытых крыніц.***

# «КАБ УСЁ АТРЫМЛІВАЛАСЯ, СЭРЦЫ ПАВІННЫ БІЦЦА Ў ТАКТ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— У вашых песнях глыбокая філасофія спалучаецца з іранічнасцю. Узнікае пытанне, які жыццёвы вопыт павінен быць, каб гэта напісаць? Што цябе натхняе і як нараджаюцца такія тэксты?***

— Часам людзі жартуюць: маўляў, у мяне такое цяжкае жыццё... Але я стараюся не пісаць пра тое, што адбываецца са мной. Ёсць пэўны свет, дзе жывуць і кахаюць адзін аднаго мае ўласныя ён і яна. Вельмі цяжка казаць, адкуль узнікаюць песні. Напэўна, нешта адбываецца на ўзроўні інтуіцыі.

***— Каханне мае свае адценні ў вашых песнях. А ў вашым жыцці яно якое?***

— Каханне ёсць. Зараз яно не падобна на тое, што я адчувала раней. Галоўны сапернік майго каханага чалавека — гэта музыка. Бо яна можа забраць усе пачуцці, якія ёсць у мяне. Маё каханне пачалося з прадчування, што я павінна быць з гэтым чалавекам. Я шчаслівая, бо мужчына, які побач са мной, — Мужчына з вялікай літары, які шмат у чым змяніў мяне. І ён прыносіць шмат шчасця ў маё жыццё.

***— Паліна, а сацыяльныя сеткі неяк спрыяюць сёння тваёй творчасці?***

— Праз сацыяльныя сеткі пра мяне даведаліся. Інакш было б цяжка прабіцца. А так была магчымасць выкінуць свае песні «УКантакце». Да таго ж сеткі дазваляюць кантактаваць з людзьмі з іншых гарадоў.

***— А як адбылася ваша сустрэча з тымі людзьмі, якія іграюць з вамі на сцэне?***

— Мы ўсе вельмі выпадкова пазнаёміліся. З Эрыкам, які са мной іграе на кантрабасе, мы пазнаёміліся, калі мне было 14 гадоў. Праўда, спачатку было знаёмства з яго братам. У прынцыпе, з гэтага пачаўся нейкі перыяд маёй беларускасці. Неяк Эрык мне напісаў, мы паразмаўлялі, а потым падчас майго ўдзелу ў «Бардаўскай восені» так атрымалася, што мы з ім за адзін дзень зрабілі аранжыроўку і з таго часу пачалі іграць разам. З Вовам, які іграе на гітары і акардэоне, мы сустрэліся напярэдадні майго сольнага канцэрта. Дзесьці за два тыдні да гэтага ў дзве гадзіны ночы Вова, які быў у мяне ў сябрах «УКантакце», запрасіў пайсці гуляць на наступны дзень у «Адрыў». Потым неяк яшчэ сустрэліся і пачалі іграць разам. Мне падаецца, што часам музычныя стасункі больш складаныя за нейкія іншыя, бо, каб усё атрымлівалася як след, трэба, каб сэрцы біліся ў такт.

***— Акрамя музыкі і навучання, чым займаецеся?***

— Мінулы год быў свабодны ад творчасці: я хадзіла на англійскую мову, займалася фітнэсам, танга, атрымала правы кіроўцы. Сёлета я зразумела, што мне будзе цяжка, я не пацягну. Таму займаюся толькі французскай мовай. Плюс у мяне ёсць два малодшыя браты, з якімі мы любім бавіць час разам. І таму той вольны час, які я магла б прысвяціць нечаму, я праводжу з імі, бо таксама лічу гэта важным. Яшчэ шмат чытаю. Электронныя кніжкі замянілі ў маім жыцці плэер.

***— А якія вам святы падабаюцца?***

— Я не люблю запланаваныя святы. Люблю дні народзінаў іншых людзей. Я магу проста паехаць да бабулі з дзядулем і мы добра пасядзім, пагаворым і для мяне гэта будзе свята. Бываюць складаныя тыдні, калі ўсе занятыя рознымі справамі, таму і сабрацца разам проста павячэраць, гэта таксама свята.

***— Па-беларуску заўсёды размаўлялі?***

— Беларускасць да мяне прыйшла сама. Не было такога, каб на мяне нехта моцна паўплываў. Ні ад каго нічога не пераймала. Я проста раблю так, як адчуваю. Неяк чытала Валянціна Акудовіча, які пісаў, што Беларусь ніколі не будзе толькі беларускай, расійскай ці польскай. І я разумею, што ніколі не буду толькі беларускай. Я вельмі люблю беларускую мову. Я думаю па-беларуску і пішу песні на гэтай мове. Але для мяне важна, каб гэта было арганічна.

***— Некаторыя лічаць, што жыць па правілах сумна. Лепш быць спантанным і непрадказальным. Вы прытрымліваецеся нейкіх правілаў ці прынцыпаў?***

— Я па знаку задыяка Авен, па стыхіі — гарачы чалавек. Але ж у



мяне мяккае імя. Яно перадае ўнутраную барацьбу. А прыгод, дзякуючы творчасці, хапае. Мне падабаецца, што маё жыццё як канструктар і, калі нешта будзе не па-мойму, я магу яго раскласці, а потым збяру нанова, і ў мяне будзе свет, у якім я буду арганічна існаваць.

***— Задумваецеся пра тое, куды будзеце рушыць далей?***

— Калі я скончу Акадэмію мастацтваў, мне будзе толькі 21 год. Таму нечага сур'ёзнага не планую. Хацелася б яшчэ атрымаць нейкую адукацыю. Але, напэўна, лепш не загадваць далёка.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з уласнага архіва спявачкі.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Орше

| № п/п | Месторасположение и площадь земельного участка | Начальная цена продажи (руб.) | Условия заключения договора аренды | Инженерное обеспечение участка | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право заключения договора аренды земельного участка по ул. Могилевской, 106 в районе гаражей ГЛХУ «Оршанский лесхоз» в г. Орше площадью 0,0060 га. Кадастровый номер 242400000004002815 | 1 320 093 | Срок договора – 5 лет. Целевое использование – под установку торгового павильона. | В квартале застройки по ул. Могилевской, 106, где расположен земельный участок, имеются сети электрической связи, с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Сети водоснабжения отсутствуют. Подключение газоснабжения возможно по окончании строительства от проектируемого газопровода по объекту «Газоснабжение жилого фонда по адресу: ул. Могилевская, д. 108 (кв. 1-6, двухэтажное здание), ул. Могилевская, д. 110 (кв. 1-8, двухэтажное здание), ул. Могилевская, д. 112, д. 114, д. 116, д. 118, д. 120, д. 122». Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – отсутствует, центральное водоснабжение – отсутствует, участок находится в санитарно-защитной зоне, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется. | 132 000 |
| 2. | Право заключения договора аренды земельного участка по ул. Зайцевской, 15 в г. Орше площадью 0,1341 га. Кадастровый номер 242400000001011879 | 16 475 405 | Срок договора – 50 лет. Целевое использование – для строительства и обслуживания жилого дома (размещение объектов жилой застройки). | В квартале застройки по ул. Зайцевской, где расположен земельный участок № 15, имеются сети электрической связи, с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Подключение водоснабжения возможно по окончании строительства объекта «Сети водоснабжения, электроснабжения, проезды и подъездные дороги к индивидуальной жилой застройке района ЖИЛ-РЭП в г. Орша». Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – отсутствует. | 1 647 500 |

1. **Аукцион состоится в 11.00 26 декабря 2012 г. в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.**

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагается документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911, с отметкой банка, а также представляются:

*гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

*индивидуальным предпринимателем* – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

*представителем гражданина или индивидуального предпринимателя* – нотариально удостоверенная доверенность;

*представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

*представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

*представителем иностранного гражданина* – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

- не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе о результатах аукциона, заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;

- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды, но не позднее трех месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся (по лоту № 1) и в срок до 19 января 2013 г. (по лоту № 2) обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;

- получить в установленном порядке разрешение на проектно-изыскательские работы и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий один год;

...Працягваць можна і далей: замеры, як паведамляецца, праводзіліся ў 113 краінах свету. Ці будзе гэта цікава чытачам? Ну, прывялі мы ў прыклад афрыканцаў. Няхай тыя не крыўдуюць: там, пры іх клімаце, нават бананы самастойна вырастаюць... Ці, зноў жа, як адзначаецца, традыцыйна замыкаюць рэйтынг мужчыны краін Паўднёва-Усходняй Азіі і Далёкага Усходу. У Кітаі ў іх распараджэнні ўсяго 11 см «шчасця», у Індыі і Тайландзе — 10 см, у Карэі — 9,7 см (прабачце, можа, памылка якая, і варта яе абскардзіць?).

Цяпер — да нашых мужчын. Як адзначаюць невядомыя нам сваімі памкненнямі ірландскія вучоныя, у беларусаў паказчык даволі такі прыстойны — 14,63 см. І, самае галоўнае, стабільны!

Любы медык раскажа, што памер такога далікатнага інструмента можа змяняцца (часова!) у бок змяншэння па шэрагу прычын. Холад там... Стрэс ці стомленасць... Але ж у кватэрах нашых цёпла. Валютныя крызіс перажылі, «цукровы» — таксама. Шмат чаго было-адбылося з мінулага года. Часам было нялёгка, нават тужліва. Магчыма, і зараз многім нялёгка. Але ж — выстаялі, і нават нічога не страцілі, не «падціснулі»! За што, вядома, найперш, думаю, дзякуй нашым паплечніцам, сяброўкам, каханым. За ваш удзел у падтрыманні стабільнасці ў гэтай справе!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# ГОДНА І ВЕСЕЛА!

## Студэнтка, актывістка і проста прыгажуня!

**НА рэспубліканскім этапе конкурсу «Студэнт года-2012», які праходзіў у Ліцэі БДУ, было шматлюдна, весела і шумна. У фінальнай бітве за ганаровы тытул сышліся восем лепшых студэнтаў краіны — пераможцы абласных этапаў і тры прадстаўнікі сталічных ВНУ. Дарэчы, стаць удзельнікам конкурсу мог далёка не кожны: адна з галоўных умоў для канкурсантаў — поспехі ў вучобе (сярэдні бал не ніжэй чым 8,0), а таксама актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, дзейнасці Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і органах студэнцкага самакіравання.**

З прывітальным словам да ўдзельнікаў і гасцей звярнуўся міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, які паабяцаў, што для пераможцы конкурсу ў яго заўсёды будуць адчыненыя дзверы: «Наша задача — падтрымаць таленавітую моладзь у рэалізацыі створаных імі інавацыйных праектаў і праграм...»

Журы павінна было выбраць лепшага па выніках пяці выпрабаванняў і ацаніць партфоліа, якое павінен быў скласці кожны ўдзельнік.

### ВІЗІТНАЯ КАРТКА:

У гэтым конкурсным выпрабаванні ад фіналіста патрабавалася не проста расказаць пра сябе, але зрабіць гэта ярка і запамінальна. Таццяна Гаўруковіч з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта прадэманстравала мужчынскія і жаночыя рысы свайго характару ў адпаведным касцюме: адзін яго бок — жаночае адзенне, а другі — мужчынскае.

Аляксандр Козыраў, студэнт Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (дарэчы, адзін з самых яркіх удзельнікаў конкурсу, на мой погляд) з гумарам расказаў пра сваё захапленне музыкай, у прыватнасці, саксафонам у дзіцячыя гады. Нягледзячы на тое, што Саша вучыцца на даволі сур'ёзным машынабудаўнічым факультэце, хлопец прызнаўся, што без сцэны не можа жыць. «А вось яна без мяне можа!» — пажартаваў канкурсант.

У выпрабаванні ўдзельнікам маглі дапамагаць іх групы падтрымкі, якія, дарэчы, вельмі гучна «хварэлі» за «свайго». Такой магчымасцю ўдала скарысталася студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Вольга Рудзік: яна расказала пра сябе, прачытаўшы рэп, а яе сябры дапамагалі ёй з залы. Група падтрымкі дапамагала і Ксеніі Шынгірэй, курсантцы Гомельскага інжынернага інстытута Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Дзяўчына з дапамогай хлопцаў-аднакурснікаў за тры хвіліны інсцэніравала на сцэне сваё ўніверсітэцкае жыццё.

### КОНКУРС ПРАМОЎНІЦКАГА МАЙСТЭРСТВА

Канкурсантам трэба было выступіць з маналогам на тэму «Чытайце! Таму што...». Прэтэндэнты на званне «Студэнт года-2012» заклікалі гледачоў чытаць, выкарыстоўваючы розныя метады.

Вольга Маслак з Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта красамоўна запэўніла аўдыторыю, што чытанне кнігі здольнае забяспечыць кожнаму надзейную апору, а вось Аляксандр Козыраў з Гомеля раіў больш чытаць хлопцам, каб... тыя вучыліся рабіць кампліменты, ясна і прыгожа выказваць свае думкі. А то: «Ну, гэта, я хацеў сказаць...» — не можа ахарактарызаваць з добрага боку прадстаўніка моцнай паловы, асабліва калі той знаёміца з дзяўчынай.


Ксенія ШЫНГІРЭЙ — лепшая!
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПРАЕКТАЎ

Ледзьве не самы сур'ёзны конкурс. Удзельнікі прадстаўлялі свае праекты (віртуальныя або ўжо рэалізаваныя ў жыцці), якія тым ці іншым чынам закранаюць праблемы маладых людзей нашай краіны. Журы атрымала ў падрыхтаванай конкурснай папцы інфармацыйныя матэрыялы па праектах кожнага ўдзельніка, а студэнтам неабходна было ярка прэзентаваць для аўдыторыі саму ідэю. Мэты, якіх хацелі дасягнуць канкурсанты, былі самыя розныя: ад згуртавання калектыву да дапамогі цяжка хворым дзецям.

Вольга Маслак з Віцебска турбуецца за першакурснікаў сваёй ВНУ, таму яе праект быў прысвечаны адаптацыі «малодшай браціі». Дарэчы, праект быў увасоблены ў жыццё — выдадзены асобны кароткі даведнік для першакурснікаў, які змяшчае ўсю неабходную для студэнта інфармацыю: пра кіраўніцтва ўніверсітэта, размяшчэнне аўдыторый, карысныя нумары тэлефонаў і гэтак далей... Даведнік уручаўся ў гэтым годзе кожнаму студэнту-першакурсніку Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Вольга Рудзік з Гродна рэалізавала ідэю дапамогі дзецям-сіротам. Дзяўчыны, якая, між іншым, з'яўляецца студэнткай медыка-псіхалагічнага факультэта, турбуе, што дзеці з дзіцячых прытулкаў маюць дастаткова нізкую самаацэнку, а таму не хочуць працягваць сваю адукацыю ў ВНУ. На працягу двух гадоў студэнты-псіхолагі праводзілі з дзецьмі ролевыя гульні, у выніку якіх у большасці наведвальнікаў заняткаў павысілася самаацэнка, з'явіўся стымул вучыцца далей і дасягаць пастаўленых мэт.

...Але самым моцным, самым кранальным стаў праект курсанткі Ксеніі Шынгірэй. Яна расказала пра сваё сяброўства з незвычайным хлопчыкам са спецыялізаванага дзіцячага прытулку, незвычайным, таму што ў яго — сіндром Даўна. Ксенія не адзін год з'яўляецца валанцёрам атрада міласэрнасці «Адкрытыя сэрцы», дзе дапамагае дзецям з цяжкімі парушэннямі псіхічнага і фізічнага развіцця. Са сваім сябрам Ксенія станцавала вясёлы танец, чым канчаткова пакарыла не толькі членаў журы, але нават балельшчыкаў іншых канкурсантаў.

### «СПАРТЫЎНЫ МІКС»

Для гэтага выпрабавання ці не ўсе ўдзельнікі падрыхтавалі выступленні з аэробікай ці гімнастыкай. Вельмі яркім аказаўся нумар зноў жа ўдзельніцы з Гомеля Ксеніі Шынгірэй: дзяўчына паказала на практыцы, што сабой уяўляе «пажарны спорт» — калі адпаведнае пажарнае абсталяванне выкарыстоўваецца не па прамым прызначэнні. Напрыклад, пажарны рукаў, аказваецца, можа выкарыстоўвацца ў якасці... скакалкі. Або яго можна перацягваць замест каната.

### ТВОРЧЫ КОНКУРС

Апошні этап змагання за званне «Студэнт года — 2012» быў ці не самым творчым. Удзельнікі спявалі, танцавалі і дэкламавалі вершы.

Студэнтка Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна Яна Буцкевіч выканала песню «Белая зямля» пад акампанемент акардэона. А вось канкурсантка з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Юлія Разнічэнка разам са сваім калектывам падрыхтавала джазавы нумар, які перамог на рэспубліканскім конкурсе «Арт-вакацыі».

Цікава вылучаўся нумар Вольгі Маслак з Віцебска, якая за некалькі хвілін паспела даць амаль паўнацэнны майстар-клас усім прысутным па вырабе караляў з лямцу.

### ВЫНІКІ

А перамагла ў выніку Ксенія Шынгірэй, якая набрала максімальную колькасць балаў па выніках усіх конкурсных выпрабаванняў. Віцэ-пераможцай можна назваць Юлію Разнічэнка: дзяўчына набрала большасць галасоў за свой гумарыстычны відэа-ролік «Я — студэнт!». Канкурсантка стала лепшай у дадатковай намінацыі «Студэнт года-2012 ONLINE».

Галоўнае, што паказаў фінал, «Студэнт года» — гэта не проста творчы конкурс, а спаборніцтва сапраўдных лідараў. Ён прайшоў у Беларусі ўжо ў другі раз. А першай пераможцай конкурсу стала летась студэнтка пятага курса Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Марына Сініца, якая сёння працуе менеджарам -эканамістам на віцебскім прадпрыемстве «Дэльта».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 26.520.
Нумар падпісаны ў 19.30 21.11.2012 г.

# ХТО Ў ФАСОЛІНЕ ЖЫВЕ?

Фасолю пашкоджвае галоўным чынам фасолевы зерняед. Гэта небяспечны палявы і складскі шкоднік фасолі. У СНД завезены з Амерыкі.



Шмат каму знаёмая сітуацыя, калі збіраем прыгожую, з выгляду здаровую фасолю, а ўжо праз месяц-два ў слоіку з ураджаем поўна жукоў. Уся справа ў тым, што лічынкі жукоў заводзяцца ў фасолі яшчэ да ўборкі ўраджаю.

Фасолю пакідаюць на корані, пакуль стручкі і зерне ў іх не высахнуць. Тут вось зерняед і адкладае свае яйкі на сухія стручкі. Фасолевы зерняед не любіць свежае зерне і аддае перавагу змрочнай цішыні склада, а не сонцу і святлу палёў.

У адной фасоліне часта пасяляецца да двух дзясяткаў лічынак. Пакуль у гэтай фасоліне ёсць ядомыя часткі, яе засяляюць пакаленне за пакаленнем. Урэшце ад яе застаецца толькі кучка спаражненняў лічынак. Скурку лічынкі не ядуць, але жук, выбіраючыся вонкі, прагрызае дзірачку. Па ліку дзірачак можна пазнаць, колькі зерняедаў прыкармілася ў гэтай фасоліне. У дарослай стадыі фасолевы зерняед уяўляе сабою жука цёмна-бурага ці светлага колеру, даўжынёй 2-3 міліметры. Падчас паспявання стручкоў фасолі назіраецца лёт дарослых жукоў. Жукі, якія здольныя пералятаць на вялікія адлегласці, прылятаюць у поле са складоў ці трапляюць разам з высеяным насеннем. Самкі зерняеда, прагрызаючы ў спінным шве спелага стручка адтуліны, адкладаюць яйкі ўнутры стручка. У складах самкі адкладаюць яйкі на зерне ці на мяшкі з фасоляй. Праз тыдзень з яек вылупліваецца лічынка. Лічынка — чэрвепадобная, белая з карычневай галоўкай — пранікае ў зерне. У адным стручку іх можа налічвацца да 20 штук. Лічынка развіваецца ў сярэднім 24 дні. Увесь цыкл развіцця зерняеда адбываецца ў зерні. Жук, які сфарміраваўся, націскае знутры на «акенца», падрыхтаванае лічынкай, і выпаўзае праз круглую адтуліну.



***Меры барацьбы.** Фасолевы зерняед — цеплалюбнае насякомае, вельмі адчувальны да нізкіх тэмператур і гіне нават ад нязначнага прамаражвання. Ва ўмовах Беларусі яго развіццё магчыма толькі пры закладцы ўраджаю ў цёплыя сховішчы.*

Не варта пазніцца з уборкай фасолі. Трэба зняць ураджай да растрэсквання бабоў.

Устаноўлена, што зерняед гіне пры знаходжанні на марозе ў 10 градусаў на працягу 12 гадзін. Пры марозе ніжэй за 12 градусаў зерняед гіне незалежна ад стадыі развіцця на працягу 2-3 гадзін. Гэтым і неабходна карыстацца пры захоўванні насеннага матэрыялу фасолі.

Каб пазбавіцца ад фасолевага зерняеда ў харчовым зерні досыць яго прагрэць пры тэмпературы 52-55 градусаў на працягу паўгадзіны. Вядома, цалкам выключыць пашкоджанне фасолі зерняедам немагчыма. Але фасолю, як правіла, перад варкай, намочваюць у вадзе на некалькі гадзін. У набрыняльм зерні добра праглядаюцца жучкі і кукалкі, і пашкоджаныя фасоліны можна адбракоўваць.

Трэба старанна правяраць зерне перад пасевам, нельга дапускаць вырошчванне пашкоджанага зерняедам зерня на насенныя і харчовыя патрэбы.

Ёсць меркаванне, што, калі захоўваць фасолю ў стручках, зерне не будзе пашкоджана. Гэта не адпавядае рэчаіснасці. Асаблівa высокая актыўнасць фасолевага зерняеда адзначаецца ў гады з высокай вільготнасцю паветра ў летні перыяд.

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.

№ 32 (454)

# РАЗМНАЖЭННЕ ТУІ

Сярод іглічных раслін туя з'яўляецца самым простым для вырошчвання. Яна непераборлівая да глеб і выдатна расце нават у нашым клімаце. Заходняя туя можа быць шаравая, у форме невысокага куста, які мае вельмі прыгожую крону, а можа быць у форме дрэва, пірамідальная. Мае кампактную каранёвую сістэму, якая ідзе ўглыб. У самым пачатку расце даволі павольна, але затым пачынае расці вельмі хутка

Туі вельмі лёгка размнажаюцца — як насеннем, так і вегетатыўна. Размнажэнне насеннем дасць добры і якасны матэрыял, але не зможа гарантаваць адпаведнасці гатунку. Толькі невялікая частка гатункаў могуць паўтарыць матчыны прыкметы, а большасць з іх утворыць гібрыды. Таму менавіта вегетатыўнае размнажэнне застаецца галоўным спосабам размнажэння туі.

Для насеннага размнажэння туі бярэцца свежае насенне, сабранае ўвосень у перыяд паспявання (яно губляе ўсхожасць ужо праз год). У самым пачатку зімы насенне высейваецца ў вазоны ці скрыні ў адмысловую сумесь глебы (3 часткі перапрэлай зямлі, 1 частка прасеянага пяску і 1 частка торфу). Пасля гэтага насенне ставіцца на 2—3 месяцы ў халадзільнік ці склеп, дзе тэмпература паветра +3 — +5 °С. Затым вазоны з насеннем выносяць на святло і ставяць у цёплае месца (+18 — +23 °С), дзе яно пачынае прарастаць. Усходы трэба даглядаць: абараняць ад прамых прамянёў і ўмерана паліваць, пры неабходнасці пікіраваць парасткі.

Расада туі развіваецца хутка: яна даволі непераборлівая. Перад тым як высадзіць расліны ў глебу, трэба паступова прывучаць іх да сонца і свежага паветра. Любую перасадку туя пераносіць добра, але ўсё ж такі праводзіць яе лепш вясной. Лёгкае пашкоджанне каранёвай шыйкі цалкам дапушчальна, а калі вы хочаце дамагчыся ад туі шчыльнай кустовай формы, то нават пажадана. Перасаджвайце буйныя расліны толькі пасля з'яўлення добрага каранёвага камяка. Звычайна для гэтага неабходна ад трох да пяці гадоў.

Пры вегетатыўным размнажэнні туі можна выкарыстоўваць некалькі спосабаў:

**Дзяленне.** Лічыцца эфектыўным для кампактных шматсцябловых гатункаў з шаравіднай, яйкападобнай ці шырокапірамідальнай формай кроны. Такім спосабам лепш размнажваць маладыя расліны. Для лепшага разрастання каранёвай сістэмы расліна саджаецца на глыбіню 5—15 см ці абганяецца. Гэты спосаб падыходзіць для летняга размнажэння. Тады каранёвая сістэма ўтворыцца да восені. Увосень расліна выкопваецца і дзеліцца.

**Гарызантальныя адводкі.** Галоўны мінус спосабу — тое, што ён не зможа гарантаваць паўтор тыповай кроны. Будзьце гатовы да таго, што з укаранёных галінак атрымаецца некалькі крывых раслін, але пры належным доглядзе праз некалькі гадоў яны набудуць патрэбную форму. Для размнажэння гэтым спосабам трэба прыхіліць галінку матчыннай расліны да зямлі і прыкапаць. На працягу года яна пусціць карані.

**Чаранкаванне.** Любы від туі можна размножыць чаранкамі. Звычайна выкарыстоўваюць 2—3-гадовыя парасткі даўжынёй да 40 см. Калі гэта маладыя гатунковыя расліны са шчыльнай шаравіднай кронай, то размножыць іх чаранкаваннем даволі лёгка.

У сумесь для чаранкоў дадаецца прамыты пясок, перліт і кіслы торф. Яна павінна добра прапускаць паветра і быць досыць рыхлай.

Лепшы тэрмін для правядзення чаранкавання — ранняя вясна, калі пупышкі толькі пачынаюць абуджацца. Улетку таксама можна рабіць чаранкаванне, але тады існуе вялікая рызыка таго, што каранёвая сістэма не паспее адужаць і ўсе расліны загінуць узімку.

Для чаранкоў бяруцца кароткія бакавыя галінкі, якія адраўнелі, пераважна з «пяткай» (невялікі кавалачак драўніны на самым пачатку парасткаў). Затым іх трэба апрацаваць растворам стымулятара росту, пасля чаго можна замацоўваць у субстраце на глыбіні 1,5—2,5 см, імкнучыся не пераварочваць угару тыльным бокам. Чараночнік павінен знаходзіцца ў паўцені.

Тэмпература паветра падчас пасадкі павінна быць прыкладна 20—23 °С. А калі чаранкаванне вы праводзіце ўвесну — то каля 15—18 °С. Сачыце за тым, каб сумесь для чаранкоў не была занадта мокрай. У той жа час важна падтрымліваць вільготнасць, таму ў гэтым выпадку неабходна менавіта апырскванне расліны, а не паліванне. Пра ўдалае ўкараненне будзе сведчыць з'яўленне новых іглінак. Калі расліны добра ўкараніліся, то яны добра перанясуць зімовыя маразы нават без хованкі, але слабыя расліны ўсё адно лепш прыбраць на зіму ў прахалоднае светлае памяшканне.

■ Футбол: ліга чэмпіёнаў

# У ТУМАНЕ

**Барысаўскі БАТЭ дома саступіў французскаму «Лілю», згубіў шанцы трапіць у далейшую стадыю Лігі чэмпіёнаў, але будзе прэзентаваць Беларусь у іншым турніры — Лізе Еўропы.**

БАТЭ — «Ліль» — матч, ад якога большасць заўзятараў не чакала паражэння. Так, напэўна, можна рэзюмаваць паядынак нашага чэмпіёна з трэцім клубам Францыі. Чакалі атакуючага футбола, завяршэння добрых галявых атак, актыўнага прэсінгу, але атрымалі тое, што маем, — 0:2. І нават цяжка вызначыць, што паўплывала на гэтыя тры паражэнні запар каманды Віктара Ганчарэнкі ў Лізе чэмпіёнаў. Недахоп класа? Адсутнасць фартуны? Агульная стомленасць футбалістаў напрыканцы сезона? А можа, усё разам? На жаль, цудоўны старт у сёлетнім розыгрышы лепшага клубнага турніру для хлопцаў Віктара Ганчарэнкі змяніўся пасрэдным працягам у выглядзе трох пракалоў-паражэнняў.



Супраць «Ліля» БАТЭ гуляў у сапраўдным тумане. Па вялікім рахунку, перспектывы «жоўта-блакітных» прайсці ў Лізе чэмпіёнаў таксам былі ў тумане. Змагацца за квіток у наступны раўнд з «Баварыяй» і «Валенсіяй» складана, але неабходна. На БАТЭ ў матчы з «догамі» ставілі букмекеры, барысаўчане з першых хвілін рушылі наперад, аднак неспадзявана атрымалі ў свае вароты два трапныя стрэлы ад саперніка. «Ліль» не гуляў супраць БАТЭ фенаменальна. Каманда Рудзі Гарсія, якая яшчэ нядаўна саступіла «Баварыі» 1:6, проста якасна зрабіла сваю працу і ў атацы, і ў абароне, хоць памылкі для гэтых французаў — таксама не чужыя рэчы.

— «Ліль» — гэта не футбольны клуб «Гарадзея», — адзначыў пасля гульні Арцём Радзькоў, абаронца БАТЭ. — Можа, гэта і дрэнна, што ў Мінск не прыехалі іх лідары. На поле выйшлі тыя, хто няшмат гуляе, — маладыя хлопцы, у якіх ёсць жаданне прадэманстраваць добры футбол. Нам у чэмпіянаце Беларусі больш зручна гуляць першым нумарам. Толькі там узровень сапернікаў крыху іншы. Яны так не караюць за памылкі, як у Лізе чэмпіёнаў. Будзем спадзявацца, што мы зробім правільныя высновы, якія павінны дапамагчы нам у Лізе Еўропы.

Цікава, што «Ліль» перад матчам тэарэтычна меў магчымасці трапіць у Лігу Еўропы. Для гэтага французам трэба было перамагаць БАТЭ з розніцай у тры мячы. Добра, што хоць гэтага не здарылася.



— БАТЭ лепш згуляў у Францыі, чым у Мінску. Выступленне вашай каманды — добрая магчымасць прадэманстраваць сябе ў Лізе чэмпіёнаў. І мы задаволены, што перамаглі ў гэтым матчы, — на пытанні «Звязды» адказвае Давід Разэгнал, чэшскі абаронца «Ліля». — Гульня была важнай, бо дома мы саступілі БАТЭ 1:3. Гэта было шокам для нас. Зараз наша стратэгія не была лепшай у свеце, аднак нармальнай для гэтай гульні. Безумоўна, БАТЭ не мае такога аўтарытэту, як «Валенсія», «Баварыя». І я таксама думаю, што беларуская каманда горшая ў нашай групе. Але гэта футбол, які якраз і прыемны тым, што маленькія каманды могуць паказваць добрую гульню.

На жаль, апошні матч на «Дынама» для БАТЭ склаўся невыразна. Спадзяёмся, Ліга Еўропы прынясе камандзе больш пазітыўных эмоцый...

***P.S.** Адметна, што ў той вечар без беларускіх паралеляў з французскім клубам не абышлося. Галкіпер Стыў Элана, які стаў непераадольнай скалой для беларусаў, пэўны час выступаў за французскі футбольны клуб «Брэст».*

***— Так, я ведаю, ведаю, што ў Беларусі таксама ёсць горад Брэст! — відавочна ажывіўся пасля спецыфічных футбольных пытанняў варатар. — Я нічога не чытаў пра яго, але неяк гуляў у відэагульню з камандай з гэтага беларускага горада. Вось такая неспадзяванка. Аказваецца, нашу геаграфію можна вывучаць не па атласах, а па футбольных відэагульнях. Цудоўна, што хоць гэта дае пэўны плён для замежнікаў.***

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота Надзеі БУЖАН**

**Калектыў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці старшыні Дабрачыннага савета музея, шчырага шанавальніка Коласавай спадчыны, краязнаўца і руплівіца музейнай справы Анатоля Васільевіча ГРЭКАВА і выказвае шчырыя спачуванні сям'і нябожчыка.**

# «ЗВЯЗДА» РАСПАЧЫНАЕ ФЭСТ

Сёлетні ранні сняжок нібы хацеў паскорыць надыход зімы, а з ёй і самага любімага і чаканага зімовага свята — Новага года. А якое ж свята без святочнага застолля? «Звязда», нібы ведаючы пра такія сюрпрызы надвор'я, своечасова падрыхтавала да ўрачыстай сустрэчы з Дзедам Марозам. Днямі «Бібліятэчка газеты «Звязда» папоўнілася новым выданнем — «Навагодні фэст ласункаў».

У выпуску можна знайсці самыя лепшыя рэцэпты закусак і салатаў, асноўных страў і дэсертаў. Не абышлі ўвагай і напоі, якія будуць дарэчы не толькі за святочным сталом. Глінтвейн, гарачы шакалад, збіцень «Хатні» дапамогуць сагрэцца зімовымі вечарамі.

А выведаць кулінарных прыхільнасці родных і сяброў дапаможа гастранамічны гараскоп, які таксама змешчаны ў выданні.

По пытаннях набыцця «Бібліятэчкі газеты «Звязда» звяртацца **па адрасе: г. Мінск, вул. Захарава, 19, пакой 17 (аддзел рэалізацыі). Тэлефоны для сувязі: (8017)284 79 65, 288 12 94.**

Любое з выданняў «Бібліятэчкі газеты «Звязда» можна знайсці ў кожным кіёску сістэмы «Белсаюздрук» і кнігарнях рэспублікі.

**Чакаем вашых прапаноў на тэму, якія парады павінна даць «Бібліятэчка газеты «Звязда». Пішыце нам на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда» альбо звяртайцеся на E-mail info@zvyazda.minsk.by, Вераніцы Марук.**



## Извещение
## о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка/ кадастровый номер | Кадастровый номер 1401000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | р-н индивидуальной застройки «Козловичи» № 335 по ГП | 1026919 | 0,1193 | для строительства и обслуживания жилого дома | 58 913 919 | 11 780 000 | 913 395 | ограничений в использовании земель нет |
| 2* | ул. Железнодорожная, 7/1 | 1027088 | 0,1304 | | 219 708 482 | 43 940 000 | 917 769 | 0,0049 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 3* | пер. Железнодорожный 4-й, 21 | 1027087 | 0,1207 | | 201 421 384 | 40 280 000 | 1 233 994 | ограничений в использовании земель нет |
| 4* | ул. Красногвардейская, 36 | 1027451 | 0,1185 | | 179 111 328 | 35 820 000 | 2 834 194 | 0,0058 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 0,4 кВ |
| 5* | ул. Подбусынская, 3 | 1027525 | 0,1201 | | 129 641 224 | 25 920 000 | 3 174 602 | ограничений в использовании земель нет |
| 6* | ул. Ковельская, 72 | 1027526 | 0,0954 | | 99 283 925 | 19 850 000 | 3 576 718 | 0,0954 га – водоохранная зона реки Мухавец; 0,0122 га – охранная зона линии связи и радиофикации; 0,0119 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения |
| 7 | ул. Кобринская, 26/1 | 1027611 | 0,0621 | | 73 385 060 | 14 670 000 | 3 855 892 | 0,0031 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000 В |

* – повторные аукционные торги

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков)**; гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924.**

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:** ● в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников); ● в течение 2 месяцев со дня получения выписки из решения горисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок; ● приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство).

**Аукцион состоится <u>28 декабря 2012 г.</u> в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 22.11.2012 г. до 17.30 21.12.2012 г.**
**(перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится <u>27.12.2012 г. в 10.00</u> по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал.**

**Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.**

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

**Лот 1.** Помещение 2-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 12,3 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 3,075 базовых арендных величин (далее БАВ); размер задатка – 0,3075 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа № 150) составляет 3,0.

**Лот 2.** Помещение 2-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 35,4 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 8,85 БАВ; размер задатка – 0,885 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 3,0.

**Лот 3.** Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 34,8 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 8,7 БАВ; размер задатка – 0,87 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 3,0.

**Лот 4.** Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 47,3 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 11,825 БАВ; размер задатка – 1,1825 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 3,0.

**Лот 5.** Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 36,8 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 9,2 БАВ; размер задатка – 0,92 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 3,0.

**Лот 6.** Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 16,9 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 4,225 БАВ; размер задатка – 0,4225 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 3,0.

**Лот 7.** Помещения 1-го этажа в капитальном строении, расположенном по адресу: ул. Мариненко, 16, в г. Полоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 66,1 кв.м (19,0; 34,1; 10,2; 2,8), срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 16,525 БАВ; размер задатка – 1,6525 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа № 150) составляет 3,0.

Предполагаемое целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 23.11.2012 г. по 26.12.2012 г. в рабочее время (с 9.00 до 17.00), по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 17.00 26.12.2012 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.**

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

<u>Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:</u>

- перечисляет задаток на с/с №3012072841543 в филиале № 200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657 Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

**Телефоны для справок (0212) 27 29 42, 27 11 58, факс (0212) 27 18 81.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

| | |
|---|---|
| <u>Лот № 1</u> Недвижимое имущество, место нахождения имущества, информация о земельном участке | **Капитальное строение инв. № 410/С-24743, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Октябрьская, д. 91, земельный участок с кадастровым номером 420850100001008761.** |
| **Начальная цена недвижимого имущества – 137 677 018 руб., сумма задатка – 14 000 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», контактные телефоны: (8 0163) 49 33 46, 49 23 12 | |
| **Сведения о недвижимом имуществе**: одноэтажное кирпичное здание бани 1956 г.п. с террасой 1956 г.п. и пристройкой 1960 г. п., общая площадь 424,2 м²; сарай блочный 1985 г.п., S – 89 м²; мощение асфальтобетонное 1956 г.п., S – 134 м². Многолетние насаждения*: 16 кленов, 5 верб, 1 липа, 4 сливы, 1 груша, 1 яблоня. | |
| **Условия использования недвижимого имущества****: вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет шести месяцев с момента заключения договора купли-продажи. | |
| **Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества** | Площадь земельного участка 0,3466 га. Срок договора аренды земельного участка по 6 февраля 2031 г. |
| **Вид вещного права на земельный участок** | Право аренды. Земельный участок предоставляется победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды. |
| **Условия использования земельного участка** | Использование земельного участка по своему назначению – для размещения объектов коммунального хозяйства, а также для реконструкции под объекты административного, торгового, социально-бытового и производственного назначения, не оказывающего вредного воздействия на окружающую среду;<br>получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка строительного проекта на строительство объекта в установленном порядке;<br>осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;<br>заключение с Волковысским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в трехмесячный срок после подписания протокола о результатах аукциона государственной регистрации права на земельный участок. |
| **Ограничения по использованию земельного участка:** на площади 0,0361 га охранная зона водопроводов и канализационных коллекторов; на площади 0,0180 га охранная зона тепловых сетей; на площади 0,0249 га охранная зона систем газоснабжения. | |
| <u>Лот № 2</u> Недвижимое имущество, место нахождения имущества, информация о земельном участке | **Капитальное строение инв. № 400/С-68251, расположенное по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Одельский с/с, дер. Бакуны, на земельном участке с кадастровым номером 422086200101000035 (присвоен предварительно).** |
| **Начальная цена недвижимого имущества – 49 200 759 руб., сумма задатка – 5 000 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Государственное внешнеторговое унитарное предприятие «Белспецвнештехника» (8 017) 284 39 55, 287 44 37. | |
| **Сведения о недвижимом имуществе:** кабельные линии электросвязи с пластмассовой оболочкой в грунте, 2005 г. прокладки, протяженностью 8113,2 кв.м, сооружение подземное, кабель частично проходит в канализации, принадлежащей РУП «Белтелеком», частично – в грунте, глубина прокладки не менее 0,7 м. | |
| Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8-0152) 74-53-86, 72-15-29, 74-53-82; www.region.grodno.by, gki.gov.by | |

* Многолетние насаждения, расположенные на земельных участках, предоставленных для обслуживания недвижимого имущества, отчуждаются победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) на безвозмездной основе в соответствии с Декретом Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности».

*** В случае невыполнения покупателем условий аукциона продавец вправе расторгнуть в одностороннем порядке договор купли-продажи в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь без возмещения победителю аукциона затрат, расходов, убытков, связанных с его расторжением.*

1. Аукцион состоится **26 декабря 2012 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. **Организатор аукциона** – Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (фонд «Гроднооблимущество»), г. Гродно, ул.17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней) тел.: (8-0152) 77 29 15, 72 25 18, сайты: http://www.region.grodno.by, http://www.gki.gov.by.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **<u>19 декабря 2012 года до 12.00</u>**.

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667», с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности».

Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства).

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

5. **<u>К заявлению прилагаются следующие документы:</u>**

документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет организатора аукциона – фонда «Гроднооблимущество» № 3642501000283, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549;

**юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

**физическим лицом** – документ, удостоверяющий личность;

**иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

**иностранным гражданином или лицом без гражданства** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

**представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Консолидированными участниками** для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

6. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

7. Организатор аукциона, опубликовавший извещение, вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. При этом сумма задатка, внесенная участником аукциона, подлежит возврату в течение 5 рабочих дней со дня отказа организатора аукциона от проведения аукциона.

8. Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, начальной цены предмета аукциона, его наименования, места нахождения и краткой характеристики недвижимого имущества, условий, с которыми продается данный предмет аукциона (в случае продажи на аукционе с условиями), шага аукциона. Шаг аукциона определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены предмета аукциона. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона от начальной цены предмета аукциона.

Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. Если по объявленной аукционистом цене предмета аукциона аукционные номера подняли два участника аукциона и более, аукционист объявляет новую цену предмета аукциона в соответствии с шагом аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона.

